Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І ЎПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 25 (439) | Панядзелак, 3 ліпеня 1939 года | Цана 20 кап.

АКТЫЎНЕЙ РЫХТАВАЦЦА ДА ДЭКАДЫ

Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве, што адбудзецца ў 1940 годзе, прадэманстрыруе перад партыяй, урадам, грамадскасцю чырвонай сталіцы і любімым правадыром таварышам Сталіным дасягненні мастацтваў БССР, якія заваяваны нашым народам за годы совецкай улады. Для таго, каб дэкада прайшла паспяхова, неабходна зараз-жа наладзіць падрыхтоўку да яе. Нашы работнікі мастацтваў павінны адчуць адказнасць за гэтае важнейшае мерапрыемства. Аднак, на сёнешні дзень аб дэкадзе многа гавораць, але вельмі мала займаюцца непасрэднай практычнай работай.

Асабліва гэта назіраецца ў кіраўніцтве опернага тэатра. Да гэтага часу не ўкамплектаван музыкантамі сімфанічны аркестр, з-за чаго нельга праводзіць рэпетыцыйнай работы над операмі, якія рыхтуюцца да дэкады. Не скончана яшчэ канчаткова адбудова новага тэатра. А гэта перашкаджае рабоце калектыва. Не забяспечан належнымі матэрыяламі афарміцельскі цэх, і ёсць небяспека, што дэкадныя могуць затрымаць выпуск дэкадных спектакляў.

Толькі зараз дамовіліся з рэжысёрам Златагоравым адносна пастаноўкі оперы «Міхась Падгорны» (кампазітар Е. Цікоцкі, лібрэта паэта-ордэнаносца П. Броўкі). Драматург-ордэнаносец А. М. Файко будзе кансультыраваць лібрэтыста. Усё гэта можна было-б зрабіць значна раней, бо першыя спектаклі «Міхася Падгорнага» паказалі неабходнасць дапрацоўкі гэтай оперы.

Для оперы «Дрыгва» (кампазітар А. Багатыроў, тэкст Е. Рамановіча) дапрацавана лібрэта. Рэжысёр Шлепянаў закончыў чарнавую работу з акторамі над вобразамі оперы. І замест таго, каб абавязаць рэжысёра Шлепянава прыступіць да работы над операй «Кветка шчасця», дырэкцыя тэатра дала яму месячны адпачынак для таго, каб ён закончыў работу над пастаноўкай ленінградскага тэатра. У той час, як паэты-ордэнаносцы П. Броўка і П. Глебка напісалі ўжо лібрэта і кампазітар Туранкоў заканчвае дапрацоўку музыкі, раптам выязджае рэжысёр. Цяпер, вядома, пачнецца спешка, якая можа дрэнна адбіцца на якасці спектакля.

Лепш абстаіць справа з балетам «Салавей» кампазітара Крошнера. Пастаноўшчык Лапухоў прарабіў вялікую работу па перапрацоўцы лібрэта. Балетны калектыў, які ўкамплектаван добрымі выканаўцамі, працуе над вывучэннем беларускага танца.

У кіраўніцтве Філармоніі (дырэктар т. Прагін) існуе няправільны погляд, што нібы Ўпраўленне павінна даць план работы, вылучыць камісію па адбору рэпертуару і тады яны пачнуць рыхтавацца да дэкады.

Філармонія з'яўляецца кіруючым цэнтрам усіх сіл, якія ўдзельнічаюць у канцэрце, а яе калектывы, на вялікі жаль, яшчэ да гэтага часу не ўкамплектаваны спевакамі, музыкантамі, танцорамі. Але яна можа прад'явіць рахунак Саюзу пісьменнікаў на паскарэнне напісання тэкстаў, каб яны не затрымлівалі кампазітараў у перакладанні твораў на музыку. Дарэчы, песні, напісаныя нашымі паэтамі і нядаўна прынятыя камісіяй, не блішчуць яшчэ сваёй якасцю. Гэта прымушае нас патрабаваць ад беларускіх паэтаў больш высокаякасных вершаў і разам з тым хутчэйшага забяспечання кампазітараў тэкстамі.

Лепш ідзе падрыхтоўка да дэкады ў калектывах мастацкай самадзейнасці. Дом народнай творчасці БССР выявіў рад калгасных калектываў, якія з'яўляюцца кандыдатамі ва ўдзельнікі дэкады, пасылаў да іх кваліфіцыраваных артыстаў, кампазітараў, балетмейстэраў, хормейстэраў для аказання ім дапамогі. Сярод усіх удзельнікаў самадзейнасці горада і вёскі разгарнулася соцспаборніцтва за лепшую падрыхтоўку да дэкады. Многія з гэтых калектываў і асобных выканаўцаў паедуць на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, а потым на дэкаду. У большасці абласных цэнтраў праведзены нарады актыва ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Неабходна дапамагчы гарадской самадзейнасці і лепшыя калектывы і асобных выканаўцаў вылучыць кандыдатамі ва ўдзельнікі дэкады. Работнікі тэатраў павінны рэальна шэфстваваць над тымі калектывамі, якім яны абавязаліся дапамагаць, бо пакуль-што шэфства ў большасці выпадкаў — папяровая фікцыя.

Белдзярждрамтэатр нядрэнна разгарнуў падрыхтоўку да дэкады. Кансультант, рэжысёр МХАТ'а тав. Раеўскі прагледзеў спектаклі — «Апошнія» М. Горкага, «Партызаны» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Эл. Самуйлёнка і прыступае да іх перапрацоўкі.

Віцебскі тэатр рыхтуе п'есу паэта-ордэнаносца П. Глебкі «Над ракой Бярозай» (рэжысёр Аксёнаў, кансультант народны артыст СССР, ордэнаносец Л. М. Леанідаў).

Упраўленне па справах мастацтваў павінна ўзначаліць усю падрыхтоўку да дэкады, а яно толькі цяпер вылучыла сваіх работнікаў адказнымі за паўныя ўчасткі работы па дэкадзе. А трэба было-б планы, спектаклі, музычныя творы абмяркоўваць сярод работнікаў мастацтваў БССР. Неабходна смялей прыцягваць да работы беларускіх мастакоў.

Паконччыўшы з пасіўнасцю і роўнадушшам, трэба перайсці да актыўнай і дзелавой падрыхтоўкі спектакляў і канцэртаў, якія будуць паказаны на дэкадзе.

Праф. М. Дабрынін

ЛЕНІН І ГОРКІ

Ленін і Горкі, горны арол і смелы сокал, геній рэвалюцыі і яе буравеснік, правадыр і пісьменнік сусветнага пралетарыята—вось тыя вобразы, тыя ўяўленні, якія ўзнікаюць у нашай свядомасці, калі мы супастаўляем гэтых выдатных людзей нашай эпохі.

«...Ленін... не проста адзін з кіраўнікоў, а кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і смела вядзе наперад партыю па нязведаных шляхах рускага рэвалюцыйнага руху...» (І. Сталін, Аб Леніне, ГІЗ, 1938 г., стар. 18). У асобе Леніна таварыш Сталін бачыць горнага арла нашай партыі. У асобе Горкага мы бачым гордага сокала, які смела кінуў выклік старому свету і абвясціў лозунг:

«Буря! Пусть сильнее грянет буря!»

На гістарычнай арэне Ленін і Горкі выступаюць адначасова. І гэта невыпадкова. Ленін пісаў, што рускі рэвалюцыйны рух перажыў тры перыяды: дваранскі, прыкладна, з 1825 па 1861 год; рознаначынскі ці рэвалюцыйна-дэмакратычны, прыкладна, з 1861 па 1895—96 годы, і, нарэшце, пралетарскі з 1895—96 гадоў. На чале першага перыяду сталі дзекабрысты і Герцэн, на чале другога—рознаначынцы, рэвалюцыйныя дэмакраты, Чэрнышэўскі і яго саратнікі, на чале трэцяга—пралетарыят. Іменна з 90 гадоў, з часу масавых стачак у Пецербурзе пралетарыят вызначае характар усяго грамадскага руху, з'яўляецца яго рухаючай сілай. Да гэтага часу і адносіцца выступленне правадыра новага тыпу, горнага арла нашай партыі Владзіміра Ільіча Леніна. Да таго-ж часу адносіцца выступленне смелага сокала, геніяльнага пісьменніка — Аляксея Максімавіча Горкага.

У 1893 годзе Ленін піша артыкул: «Новыя гаспадарчыя рухі ў сялянскім жыцці» (з прычыны кнігі Постнікава «Паўднёва-руская сялянская гаспадарка»), прымае ўдзел у марксісцкім гуртку (у Самары), дзе і чытае свой першы артыкул. У 1894 годзе адбылося першае выступленне Леніна ў Маскве.

У 1892 годзе ў тбіліскай газеце «Кавказ» з'яўляецца першае апавяданне Горкага «Макар Чудра». Яно было пачаткам яго выдатнай літаратурнай дзейнасці. Так у самым пачатку, пры сваім выступленні на гістарычную арэну, пралетарыят высунуў двух выдатных людзей—Леніна і Горкага. Яны не маглі не ведаць і не любіць адзін аднаго, бо яны працавалі над адной і той-жа гістарычнай справай—справай вызвалення чалавецтва і пабудовы сацыялізма. Яны былі звязаны з лёсам рабочага класа і з'явіліся яго першымі выразнікамі.

Ленін — правадыр новага тыпу, Горкі—пісьменнік новага тыпу. Гэта глыбока знамянальна і законамерна. «Увосень 18 года,—успамінае Горкі,—я запытаў сормаўскага рабочага, якая, на яго погляд, самая рэзкая рыса Леніна?—Прастата. Просты, як праўда. Сказаў ён гэта, як добра прадуманае, даўно вырашанае».

Прастата і скромнасць вылучаюць Леніна і Горкага. Гэту рысу адзначыў і таварыш Сталін: «Толькі пасля я зразумеў, што гэта прастата і скромнасць Леніна, гэта імкненне застацца незаўважаным ці, ва ўсякім выпадку, не кідацца ў вочы і не падкрэсліваць сваё высокае становішча, — гэта рыса прадстаўляе адзін з самых моцных бакоў Леніна, як новага правадыра новых мас, простых і звычайных мас найглыбокіх «нізоў» чалавецтва». (Сталін, Аб Леніне, ОГІЗ, 1938, стар. 20). Такі правадыр новага тыпу, які адрозніваецца ад усіх астатніх правадыроў.

Горкі прыводзіць цікавую гутарку рабочых:

«—Не ведаю, можа быць тут, у Еўропе, у рабочых ёсць і другі, такі-ж разумны чалавек,—Бебель, ці яшчэ хто. А вось, каб быў другі чалавек, якога я-б адразу палюбіў, як гэтага—не верыцца!

Другі рабочы дадаў усміхаючыся:

— Гэта — наш!

Яму запярэчылі:

— І Плеханаў—наш.

Я пачуў трапны адказ:

— Плеханаў—наш настаўнік, наш пан, а Ленін—правадыр і таварыш наш».

Горкі таксама просты, як праўда. Аляксея Максімавіча мы ведаем як чалавека ў вышэйшай ступені простага і скромнага. Ён вышаў з «нізоў», пражыў цяжкае жыццё і прайшоў жорсткую школу.

Аўтабіяграфічныя апавяданні і такія вялікія творы, як «Дзяцінства», «У людзях» і «Мае універсітэты» добра паказваюць нам тое асяроддзе, з якога вышаў Горкі. Прастаце Горкага навучыла само жыццё. Шматлікія пісьмы і гутаркі з пісьменнікамі паказваюць, што Горкі больш за ўсё цаніў прастату і яснасць. Адзін прыклад: «Вы, відаць, нямала чыталі Б-та і сучаснікаў, гэта сказалася залішняй цвяцістасцю вашых вершаў, у чым значна больш маладога форсу і задору, чым густу і музыкі. Прыгожасць у прастаце — гэта аксіома. Як-бы мы ўсе ні кідаліся, а ў адну з субот і заўсёды молім напрасцей, паясней!»—піша ён маладому пісьменніку.

Па прастаце і скромнасці Горкі нагадвае нам Леніна:

«Я такі-ж радавы пісьменнік, як і ўсе, якія тут прысутнічаюць, — гаварыў Аляксей Максімавіч на з'ездзе пісьменнікаў,—і таму эпітэтаў не трэба, не патрэбны яны...»

Два геніяльных чалавекі былі простымі і скромнымі таму, што былі людзьмі новага тыпу, людзьмі, высунутымі найшырокімі народнымі масамі і моцна з ім звязанымі. Адсюль сапраўдная і глыбокая іх народнасць.

І ў Леніна і ў Горкага было незвычайна развіта пачуццё любві да людзей, любві да чалавека.

«—Не, вы падумайце: дзеля чаго сытыя гоняць галодных на бойню аднаго супроць другога? Можаце назваць злачынства больш ідыётычнае і агіднае?» Гэта заўсёдная дума Леніна аб людзях, аб іх шчасці рабіла яго незвычайна мэтаімкнёным. І яна, гэта любоў да людзей, сказвалася ў ім ва ўсім. Горкі ўспамінае: «Быў у ім нейкі магнетызм, які прыцягваў да яго сэрцы і сімпатыі людзей працы. Ён не гаварыў па-італьянску, але рыбакі Капры, якія бачылі і Шаляпіна, і нямала іншых буйных рускіх людзей, якімсьці чуццём адразу вылучылі Леніна на асобае месца. Абаяльны быў яго смех—«задушэўны» смех чалавека, які добра ўмеючы бачыць нязграбнасць чалавечага глупства і акрабатычныя хітрасці розуму, умеў цешыцца дзіцячай наіўнасцю «простым сэрцам».

«Стары рыбак, Джыаванні Спадаро, сказаў аб ім:

— Так смяяцца можа толькі чэсны чалавек.

Гойдаючыся ў чаўне на блакітнай і празрыстай, як неба, хвалі, Ленін вучыўся вудзіць рыбу «з пальца»—лесай без вудзілна. Рыбакі тлумачылі яму, што падсякаць трэба, калі палец адчуе дрыжанне лесы:

— Козі: дрынь-дрынь. Капіш?

Ён адразу-ж падсек рыбу, павёў яе і закрычаў з захапленнем дзіцяці, з азартам паляўнічага:

— Ага! Дрынь-дрынь!

Рыбакі аглушальна і таксама, як дзеці, радасна зарагаталі і празвалі рыбака:

«Сіньор Дрынь-Дрынь».

Ён паехаў, а яны ўсё пыталіся:

— Як жыве Дрынь-Дрынь? Цар не схапіў яго, не?»

Такім быў Ленін. Ён умеў не толькі любіць, але і ненавідзець. У капіталістычных умовах жыцця нельга шчыра любіць, не ўмеючы ненавідзець.

Уся мастацкая творчасць Горкага, уся яго публіцыстыка, уся велізарная перапіска кажа нам аб тым, што ён авалодаў найцяжэйшым мастацтвам любві да людзей. Але і ён, як Ленін, умеў не толькі страсна любіць жыццё і людзей, але горача ненавідзець ворагаў. Аддаючы ўсё сваё жыццё за шчасце людзей, Горкі заклікаў да бязлітаснай барацьбы супроць ворагаў народа. «Калі вораг не здаецца—яго знішчаюць»,—пісаў Аляксей Максімавіч.

На глебе адносін да людзей, у прыватнасці да інтэлігенцыі, паміж Леніным і Горкім былі разыходжанні. Зразумела, Ленін быў праў асабліва па пытаннях аб жорсткасці рэвалюцыйнай тактыкі і быту.

«—Чаго вы хочаце?—здзіўлена і гнеўна пытаўся ён.—Ці магчыма гуманнасць у такой небывала лютай бойцы? Дзе тут месца мяккасардэчнасці і вялікадушнасці?

— Якой мерай вымяраеце вы колькасць неабходных і лішніх удараў у бойцы?—спытаўся ён мяне аднойчы, пасля гарачай гутаркі». Горкі часта звяртаўся да Леніна з рознымі просьбамі. «І ўсё-ж такі,—заўважае Горкі,—я не памятаю выпадку, калі-б Ільіч адмовіў у маёй просьбе».

Пралетарскі гуманізм, чалавечнасць, любоў да працоўных і нянавісць да ворагаў — вось рысы, якія зблізілі двух геніяў. Гэта любоў да людзей насіла і ярка выражаны характар гордасці рускім чалавекам, рускім мастацтвам. «Часам гэта рыса здавалася мне зусім чужой Леніну і нават наіўнай, але потым я навучыўся чуць у ёй водгук глыбока схаванай, радаснай любві да рабочага народа». Такая-ж была любоў і самога Аляксея Максімавіча.

Любоў да людзей, гуманізм, выцякалі з глыбокага ведання жыцця, ведання людзей, іх псіхалогіі. Выдатны ў гэтых адносінах факты ацэнкі Леніным многіх вядомых людзей. Ленін адчуваў фальш і няшчырасць і вельмі рэдка памыляўся. Горкі прыводзіць гутарку з Леніным аб Алексінскім.

«—Можаце ўявіць: з першай-жа сустрэчы з ім у мяне з'явілася да яго чыста фізічная агіда. Непераможная. Ніколі, ніхто не выклікаў у мяне такога пачуцця. Прыходзілася разам працаваць, усяляк стрымліваць сябе, няёмка было, а—адчуваю: не магу я цярпець гэтага вырадка!

І, здзіўлена пацiснуўшы плячамі, сказаў:

— А вось нягодніка Маліноўскага не мог раскусіць. Вельмі гэта цёмная справа, Маліноўскі...»

Шырока, шматвобразна і глыбока ведаў жыццё Аляксей Максімавіч. Нават Ленін гаварыў яму, што яго вопыт вельмі рознастайны, нават Ленін гаварыў, што ў Горкага трэба вучыцца, як глядзець і слухаць! Веданне жыцця ў Горкага выдатнае. Ён столькі бачыў і столькі перажыў, у яго такі невычарпальны запас уражанняў, што мала пісьменнікаў у рускай і сусветнай літаратуры можна паставіць з ім побач у гэтых адносінах. Пры той-жа багатай памяці і развітым пачуцці назіральнасці, якімі валодаў Аляксей Максімавіч, яго веданне жыцця заўсёды павялічвалася, нічога не губляючы, а ўсё больш і больш узбагачаючы яго творчы вопыт. Больш за ўсё Горкі цаніў у чалавеку і пісьменніку яго ўласнае я, яго самога сябе. «А ўрэшце—жадаю ўсёй душой—шукайце сябе самога... Шукайце сябе. Усіх слухайце, усіх чытайце—нікому не верце і ўсюды вучыцеся. Гэтым і можаце перамагчы... Скажыце сабе: ў мяне ёсць сваё! І беражыце гэта сваё...

Прыміце добрую параду чалавека, які жадае свабоднага развіцця дараванню вашаму: усіх слухайце, усё чытайце, ўсяму вучыцеся, але—беражыце, але—шукайце сябе самога, нікому не падпарадкоўвайцеся, усё правярайце і не давайце душы вашай у палон уплывам, чужым ёй...»

Такія парады вынікалі з глыбокага ведання жыцця, з велізарнага вопыту творчай работы. Гэта рыса вельмі важная і для пісьменніка і для правадыра. Ёй у вышэйшай ступені былі надзелены і Ленін і Горкі, правадыр і пісьменнік пралетарыята.

Па свайму стылю жыцця Ленін і Горкі блізка сталі адзін да другога. Яны належалі да тых людзей, да якіх нельга было адносіцца абыякава, іх можна было ці любіць ці ненавідзець. Аляксей Максімавіч ва ўспамінах аб Леніне адзначае:

«Злоснае імкненне псаваць рэчы выключнай прыгожасці мае адну і тую-ж крыніцу з гнусным імкненнем зганьбіць ва што-б там ні стала чалавека незвычайнага. Усё незвычайнае перашкаджае людзям жыць так, як ім хочацца. Людзі прагнуць—калі яны прагнуць—зусім не карэннага змянення сваіх соцыяльных звычаяў, а толькі пашырэння іх. Асноўны стогн і плач большасці:

«Не перашкаджайце нам жыць, як мы прызвычаіліся!»

Владзімір Ленін быў чалавекам, які так перашкодзіў людзям жыць прывычным для іх жыццём, як ніхто да яго не ўмеў гэта зрабіць.

Нянавісць сусветнай буржуазіі да яго аголена і агідна ясная, яе сінія, чумныя плямы ўсюды блішчаць ярка. Агідная сама па сабе, гэта нянавісць кажа нам аб тым, які вялікі і страшны ў вачах сусветнай буржуазіі Владзімір Ленін, — натхніцель і правадыр пралетарыяў усіх краін. Вось ён не існуе фізічна, а голас яго ўсё гучней, пераможней гучыць для працоўных зямлі, і ўжо няма такога кутка на ёй, дзе-б гэты голас не абуджаў волю рабочага народа да рэвалюцыі, да новага жыцця, да будаўніцтва свету людзей роўных. Усё больш упэўнена, мацней, паспяховей робяць вялікую справу вучні Леніна, наследнікі яго сілы».

Але-ж сам Аляксей Максімавіч прадстаўляе ўвасабленне незвычайнага чалавека, які перашкодзіў людзям жыць звычайным жыццём. Варта нам прыгадаць яго выдатную публіцыстыку, яго пісьмы, яго мастацкую творчасць. Яго, як і Леніна, ненавідзелі руская і сусветная буржуазія і мяшчанства. Стыль жыцця ў іх быў аднолькавы. Ён вызначыўся вельмі рана, пры самым уступленні іх на гістарычную арэну. З'яўленне Горкага ў літаратуры па ўспамінах сучаснікаў было падобна асвяжаючай буры. «Нас, ранніх соцыял-дэмакратаў, маладых марксістаў, Горкі цікавіў асабліва і вабіў да сябе асабліва моцна. У яго першых мастацкіх творах для нас быў радасны адыход таленавітага пісьменніка ад традыцыйнага народніцкага мужыка да гарадскога чалавека—няхай пакуль да басяка, не да рабочага, але ўсё-ж і басяк з яго надзвычайным горкаўскім прэзрэннем да ўстаяўшагася гнілога быту быў для нас жаданым прадвеснікам новага. Радасны быў і тон горкаўскіх апавяданняў: упрыгожаная, урачыста-узнятая мова маладога пісьменніка, напеўная і гучная, успрымалася намі, як смелая песня бадзёрага і гнеўнага бунтара, як заклік да рашучага разрыву з настроямі народніцкага смутку». (В. Дзясніцкі. «Горкі ніжагародскіх год»).

Такім-жа новым і незвычайным было і паяўленне Леніна ў марксісцкім асяроддзі. Адзінства жыццёвага стылю ў Леніна і Горкага сказваецца ва ўсім. Яно выяўляецца ў іх здольнасці захапляцца той справай, за якую яны змагаюцца, у іх агітатарскім захапляючым запале, у майстэрстве заражаць сваім захапленнем, у іх адносінах да рэвалюцыі, да барацьбы з старым светам, у актыўных дзейных адносінах да жыцця і т. д. і т. д.

Па ўсіх гэтых пытаннях можна знайсці многа агульнага у Леніна і Горкага, і ўсё гэта законамерна.

І адзін і другі з'явіліся на грэбні рабочага руху, і геній рэвалюцыі і яе буравеснік былі лепшымі і найгеніяльнымі сынамі рускага народа. Вялікі і магутны рускі народ даў чалавецтву двух геніяў—Владзіміра Ільіча Леніна і Аляксея Максімавіча Горкага. Іх справа—неўміручая, бо ў кожнай перамозе совецкага народа, у кожным пavароце гісторыі мы бачым урачыстасць іх справы.

НОВЫЯ ПЕСНІ

Гэтымі днямі пад старшынствам пісьменніка-ордэнаносца М. Лынькова камісія па адбору тэкстаў песень для дэкады беларускага мастацтва ў Маскве адобрыла наступныя тэксты: «Песня пра Сталіна» Якуба Коласа, «Песня пра Сталіна» і «Прывітанне Маскве» М. Клімковіча, «Совецкая Беларусь» Э. Агняцвет, «Песня аб Сталіне» А. Русака.

Дзве песні — «БССР» Я. Коласа і «Песня пра Сталіна» Міронччыка рэкамендаваны для калектываў мастацкай самадзейнасці.

Мастак В. В. Волкаў заканчвае работу над фрызам «Кастрычнік на Беларусі» для беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

На здымку: В. Волкаў за работай. Фота Шышко.

МАСКВА,

Саюз пісьменнікаў, Н. АСЕЕВУ

Пісьменнікі БССР горача вітаюць Вас у дзень Вашага 50-годдзя і ўпэўнены, што яшчэ доўгія, доўгія годы Вы будзеце радаваць нашу радзіму прыгожымі, бадзёрымі, маладымі вершамі.

Я. Купала, Я. Колас, М. Лынькоў, З. Бядуля, П. Броўка, П. Глебка, К. Крапіва, М. Клімковіч, А. Куляшоў, І. Гурскі.

ПРАГЛЯД ЭСКІЗАЎ ВЫСТАЎКІ 1940 года

26 чэрвеня ў Доме мастака адбыўся прагляд эскізаў работ мастакоў да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

З выстаўкай падрабязна азнаёміліся старшыня Соўнаркома БССР тав. Кісялёў, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін, намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Захараў, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. Озірскі.

У заключэнне прагляду тав. Кісялёў адзначыў вялікую работу, праведзеную мастакамі БССР, падкрэсліўшы, што найбольш адказны этап яшчэ наперадзе. Тав. Кісялёў заклікаў мастакоў да новага творчага ўздыму і паспяховай работы над ажыццяўленнем эскізаў.

3 ліпеня адбудзецца рэспубліканская творчая нарада мастакоў для абмеркавання прадстаўленых на выстаўцы эскізаў.

КОНКУРС НА ДЗІЦЯЧУЮ П'ЕСУ І ПЕСНЮ

За апошнія годы вырасла і шырока развілася вучнёўская самадзейнасць у школах БССР. Амаль ва ўсіх школах арганізаваны драматычныя, харавыя, музычныя і іншыя гурткі. Але работу гурткоў стрымлівае вельмі малы выбар цікавых і мастацка поўнакаштоўных аднаактавых п'ес і харавых дзіцячых песень.

У сувязі з гэтым ЦК ЛКСМБ, рэдакцыя газеты «Піонер Беларусі», Наркамасветы, Упраўленне па справах мастацтваў, Саюз пісьменнікаў і аргкамітэт Саюза кампазітараў абвясцілі закрыты конкурс на лепшую дзіцячую аднаактавую п'есу і дзіцячую песню. Умовы конкурса наступныя:

Тэматыка твораў не абмежаваная. Галоўныя з тэм: удзел піонераў у абароне краіны (пагранічныя матывы), дзеці—героі грамадзянскай вайны, героіка нашых дзён (мары дзяцей аб будучыні, аб рабоце, аб подзвігах на карысць шчаслівай радзімы), быт совецкіх дзяцей (вучоба, канікулы, лагерны адпачынак, вынаходніцтвы, фізкультура) і інш.

Ад тэкста песні патрабуецца, каб ён быў даходчывым да дзяцей, простым, ясным, высокамастацкім.

Музыка песні павінна быць напеўнай, рытмічнай, павінна лёгка запамінацца, мастацка поўнацэннай, разлічанай на выкананне аднагалосным або двухгалосным дзіцячым хорам.

П'еса разлічваецца на выкананне школьнымі драмгурткамі і гурткамі калгаснай моладзі. Яна павінна быць выключна сцэнічнай, кароткай, высокамастацкай і даходчывай для дзяцей.

Устаноўлены наступныя прэміі: за лепшыя песні — адна першая прэмія—за тэкст 2000 руб., за музыку—3000 руб., дзве другія прэміі—тэкст 1000 руб., музыка—2000 руб., дзве трэція прэміі—тэкст 750 руб., музыка 1500 руб.

За лепшыя п'есы ўстаноўлена сем прэмій: першая ў 5000 руб., тры другія па 3500 руб., тры трэціх па 2000 руб.

У журы конкурса на лепшую п'есу ўвайшлі т.т. М. Лынькоў (старшыня), Бядуля, Юдэлевіч, Макаўэвіч, Ефройкін, Бярозкін.

У журы па песнях: Смольскі (старшыня), Александроўская, Бергер, Шварц, Карповіч, Вольскі, Канстанцінаў.

Тэксты песень павінны быць прадстаўлены да 1 жніўня, музыка да іх—да 1 верасня, п'есы да 1-га верасня.

Для практычнага кіраўніцтва конкурсам вылучана камісія ў складзе: Бярозкіна (старшыня), Гурскага і Палонскага.

АБЛАСНАЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

23 чэрвеня адбылася скліканая Віцебскім аддзелам па справах мастацтваў першая абласная нарада работнікаў мастацтваў. На нарадзе прысутнічала 53 чалавекі.

Нарада заслухала даклад начальніка Віцебскага абласнога аддзела па справах мастацтваў тав. Саламоніка аб становішчы мастацтва ў вобласці і далейшых задачах, вынікаючых з рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б). У спрэчках выступіла 18 таварышоў.

Рэзкай крытыцы была падвергнута работа абласнога Дома народнай творчасці, які ў вобласці не вядзе ніякай работы. У калгасах вобласці нават не ведаюць пра існаванне Дома народнай творчасці.

Удзельнікі нарады ўнеслі шмат каштоўных прапаноў, якія абласны аддзел мастацтваў і Дом народнай творчасці павінны ажыццявіць. Напрыклад, унесена прапанова арганізаваць паказальныя гарадскія сімфанічны і духавы аркестры і хор.

Узняты таксама пытанні аб арганізацыі гарадскога гардэроба для абслугоўвання гурткоў самадзейнасці, аб перадачы падпарадкаваных горсовету тэатральных пляцовак абласному аддзелу па справах мастацтваў. У Віцебскай вобласці ёсць тры такія пляцоўкі: у Віцебску, Оршы і Полацку. Выкарыстоўваюцца яны бескантрольна.

Нарада прыняла адозву да работнікаў мастацтваў вобласці з заклікам па-бальшэвіцку разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва па падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Гр. МАКСІМАЎ.

Віцебск.

У ТЭАТРЫ ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР ІМЯ КРУПСКАЙ

29 чэрвеня адбыўся папярэдні прагляд п'есы «Цудоўная дудка» В. Вольскага, напісанай па матывах беларускіх народных казак (пастаноўка засл. арт. БССР Е. Міровіча, мастак О. П. Марыкс і кампазітар Н. Шчэглоў). На праглядзе прысутнічалі прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і Ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, якія з вялікім захапленнем глядзелі гэты цікавы спектакль. 1 ліпеня адбылося абмеркаванне спектакля «Цудоўная дудка» ў калектыве тэатра, у якім прыняў удзел нач. тэатральнага аддзела Упраўлення па справах мастацтваў тав. Юдэлевіч. Тав. Юдэлевіч адзначыў, што спектакль «Цудоўная дудка» з'яўляецца вялікай творчай удачай як для аўтара, так і для калектыва тэатра і рэжысёра-пастаноўшчыка тав. Е. Міровіча. Пасля дапрацоўкі раду дробных дэталей, асабліва па лініі дэкарацыйнага афармлення, спектакль безумоўна можа быць паказан у Маскве на дэкадзе дзіцячых тэатраў СССР.

Зараз калектыў тэатра працуе над канцэртам для піонерскіх лагераў. У праграме канцэрта аднаактавая камедыя, тэатралізаваны джаз, песні совецкіх кампазітараў, рускія і беларускія народныя песні, танцы і мастацкае чытанне твораў Маякоўскага, Льва Касіля, П. Броўкі, Я. Купалы, Гусева і інш. Рэжысёр-канцэрта Н. А. Кавязін.

8 ліпеня брыгада з гэтай праграмай выедзе на месяц у піонерскія лагеры рэспублікі.

М. Н.

ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР

1 ліпеня ў менскім Доме Чырвонай Арміі адбыўся літаратурны вечар рускай секцыі ССП БССР.

Уступнае слова зрабіў тав. М. Клімковіч. Ён адзначыў цесную сувязь беларускай літаратуры з рускай, коротка ахарактарызаваў паасобных членаў рускай секцыі.

З чыткай сваіх твораў выступілі маладыя паэты і пісьменнікі — А. Шарапаў, Е. Садоўскі, А. Гейне, К. Цітоў, А. Астрэйка, А. Левіна і інш.

На вечары прысутнічаў маскоўскі паэт С. Розаў.

Літаратурны гурток у калгасе

У калгасе «Трэці рашаючы» Кавалёўскага сельсовета Бабруйскага раёна арганізаван літаратурны гурток. У гуртку займаецца не толькі моладзь, але і старыя калгаснікі. На занятках прысутнічаюць да 45 чалавек. Калектыўна прачытаны і абмеркаваны у гуртку творы совецкіх пісьменнікаў: «Дрыгва» Якуба Коласа, «Народжаныя бурай» Н. Остроўскага і «Будучыня» Эдуарда Самуйлёнка.

У плане далейшай работы гуртка — чытка і абмеркаванне такіх твораў, як «Анна Карэніна» Л. Талстога і «Маці» М. Горкага. Гуртком кіруе настаўнік мясцовай школы тав. Семянцоў. Гуртkоўцы выпускаюць раз у два тыдні сваю літаратурную насценгазету.

Міх. ПУХАЛЬСКІ.

АЛЬМАНАХ „ДРУЖБА НАРОДОВ“

Альманах «Дружба народов» з нецярплівасцю чакалі чытачы. Усе ведалі, што гэты альманах — адно з завяшчанняў вялікага Горкага. Таму з'яўленне альманаха на кніжным рынку было сустрэта з надзвычайнай цікавасцю. Станоўчая ацэнка вялікай і патрэбнай справы яшчэ больш умацавалася, калі чытачы азнаёміліся з журналам. Многія, і я ў тым ліку, — прачыталі яго літаральна не адрываючыся. Парадавала перш за ўсё тое, што рэдакцыя так поўна і своечасова прадставіла матэрыял аб Т. Г. Шэўчэнка, бо юбілей вялікага украінскага паэта-рэвалюцыянера ў гэтым годзе стаў дэманстрацыяй дружбы народаў, дэманстрацыяй еднання літаратур.

Даўшы мастацкую біяграфію Шэўчэнка, напісаную М. Зошчэнка, навелы, напісаныя нашымі украінскімі таварышамі, лепшыя пераклады вершаў Т. Г. Шэўчэнка, альманах уваскрасіў перад сваімі чытачамі светлы вобраз непахіснага змагара-паэта. І гэтым альманах значна пашырыў круг людзей, да якіх дайшло слова Шэўчэнка.

З вялікай цікавасцю чытаецца аповесць аднаго з лепшых пісьменнікаў Савецкай Арменіі — Ст. Зарана, у добрым перакладзе Сукіасяна. Спелае майстэрства, глыбокае веданне абстаноўкі і душы чалавечай — прыкоўваюць чытача да гэтай аповесці. Шкада, што альманах не мог надрукаваць аповесці поўнасцю. Сардэчна радуешся за братнюю армянскую літаратуру, якая вырасціла аднаго з лепшых пісьменнікаў Совецкага Саюза.

Апавяданне тав. Бергельсона і аповесці тав. Дзесняка жыва раскрываюць перад чытачом вечна новыя старонкі грамадзянскай вайны, герaічныя подвігі совецкіх людзей. Альманах падабраў і змясціў рад добрых вершаў грузінскіх, азербайджанскіх, кіргізскіх, яўрэйскіх, украінскіх паэтаў. Гэта мае велізарнае значэнне, бо пераклады паэзіі марудней даходзяць да чытача нацыянальных рэспублік, чым проза. Зборнікі вершаў выдаюцца самімі паэтамі раз у 2—3 годы, а перакладаюцца яшчэ радзей. А такія вершы, як «Нараджэнне песні», «Паляўнічая» Іло Масашвілі, як «Лёдаход» П. Маркіша, як песня «Аб цудоўнай гары Алатао» тав. Баканбаева ці «Навалунне ў Кахеціі» тав. Г. Леанідзе заслугоўваюць таго, каб іх ведалі ўсе нашы паэты і ўсе чытачы. Яны глыбока лірычныя, свежыя, народныя і па-майстэрску напісаныя.

Заслугоўвае ўхвалы адбор і надрукаванне ўзораў народнай творчасці: армянскай казкі «Пятак візіра» і таджыкскай казкі «Тыгр і ліса». Гэта дае магчымасць параўнаць народную творчасць братніх народаў, выявіць сюжэты, агульныя для ўсіх народаў, прасачыць, як гістарычныя ўмовы асобных народаў стварылі новыя варыянты. Ды і масштабу пісьменніку ёсць чаму навучыцца ў народнай мудрасці, у народнай паэзіі. Я ведаю рад казак беларускага народа, якія з'яўляюцца класічным узорам закончаных навел і рад песень, якія могуць служыць узорамі лірычных вершаў. Удалыя таксама па глыбокай народнай мудрасці, па кандэнсацыі жыццёвага вопыта і па трапнасці слова прыведзеныя ў альманаху пагаворкі.

З недахопаў альманаха я хацеў-бы адзначыць перш за ўсё афармленне журнала. Папера і вокладка не могуць служыць прыкладам нават для нашых рэспубліканскіх журналаў. Не звернута дастатковай увагі на крытычны аддзел: гэта найбольш недасканалае з усяго зместу кнігі. Хацелася-б бачыць у журнале фатаграфіі, ці нават каляровыя рэпрадукцыі лепшых новых карцін мастакоў братніх рэспублік, самыя лепшыя ўзоры народнай творчасці: малюнак, разьба, лепка. Гэта ажывіла-б вонкавы выгляд альманаха і пашырыла-б яго пазнавальнае значэнне.

На маю думку, патрэбна ператварэнне альманаха ў штомесячны журнал. Штомесячны выхад альманаха даў-бы магчымасць друкаваць не толькі ўрыўкі з вялікіх твораў, але ўвесь твор поўнасцю. Тады чытач меў-бы поўнае ўяўленне аб росце братніх літаратур і асобных пісьменнікаў. Існуючыя журналы, пры ўсім сваім жаданні, зрабіць гэтага не могуць: у іх не хопіць ні месца, ні часу, а галоўнае — ні адзін з іх не з'яўляецца цэнтрам, куды-б цягацелі пісьменнікі братніх літаратур. Такім цэнтрам безумоўна стане альманах «Дружба народов».

Марудпасць перакладаў, часам недастатковая аператыўнасць у адшуканні добрых перакладчыкаў значна змяншаюць для чытача магчымасць знаёміцца з лепшымі творамі пісьменнікаў нацыянальных рэспублік у перакладах. Ды і тыражы выдаваемых перакладаў такія, што нават у абласных цэнтрах рэспублікі нельга дастаць добрую перакладную кнігу. Да гэтага часу ўдаецца «праскочыць» у перакладах толькі невялікай колькасці найбольш шчаслівых пісьменнікаў. Усё гэта настойліва высоўвае пытанне аб выданні штомесячнага літаратурнага журнала, ставячага сабе тыя мэты, якія паставіў і так удала пачаў выконваць альманах.

М. КЛІМКОВІЧ.

Прэм'ера патрыётычнай п'есы «Палкаводзец Сувораў» у Цэнтральным тэатры Чырвонай Арміі (Масква). П'еса напісана маладымі совецкімі драматургамі І. В. Бахцеравым і А. В. Разумоўскім.

На здымку: артысты Б. Н. Нечаеў у ролі Суворава (злева) і В. Н. Пестоўскі у ролі Баграціёна.

Фотахроніка ТАСС.

ЦІМОХ КРЫСЬКО.

ДВА ВЕРШЫ

1. ПЕРШАЯ ПЕСНЯ

Скажы, сінявокае шчасце,
Якою пуцінай прышло ты.
Якою часінай, хвілінай?
Не чуў я,
Не бачыў,
Не знаў,
Якім ты ключом адамкнула
Цесную цёмную клетку.
Дзе спала маленькая птушка
Доўгім спакойным сном?
Я раннем удосвет падняўся.
Сонечны зыркі абечак
Нізка павіс над садам,
Аж слепяцца вочы — вясна!
Доўга стаяў і дзівіўся,
А схамянуўся — позна.
Устрапянулася птушка,
Тугім павяла крылом.
І стала так лёгка. Здалося,
Лясы расступіліся. Рэкі
Блакітнымі каснікамі
Палі і лугі абвілі.
Стала так лёгка. І песня
Празрыстай сярэбранай флейтай
Зайшлася у пералівах,
У шырокі прастор паплыла,
Што людзі спыняліся, слухалі,
У чыстае неба глядзелі:
— Жаваранак! Жаваранак! Бачыш?
— Вяшчун вясны прыляцеў!
І хто-б з іх падумаў, паверыў,
Што ў небе не голас птушыны,
А — першая весняя песня
Юнацкага сэрца майго.

2. НА АДЗІНОЦЕ

Зязюльчын лён, гладышыкі, чабор,
Зноў пазнаю вас у траве мурожнай,
Шуміць неўрымслівы, спрадвечны бор
На сухавеі лістам кожным.
Я хітраю сцяжынкаю лясной
Іду у салаўіныя харомы,
З чырвонаствольай, гонкаю сасной
Вітаюся, як даўнішні знаёмы.
Са свежай сакавітае вярбы
Я дудку выкручу з дзівоснымі ладамі,
Сам-на-сам хочацца пабыць
З табою, шчыры бор, з тваімі
жыхарамі.
Надрэжу тонкую, пахучую кару,
Хай плача дрэва, пырскае на рукі.
Згадаць далёкую пару
Здавён-даўна мне рупіць.
Успомніць босага маленства дні,
Грыбныя пні, маліннік і сунічнік,
І светляковыя агні,
І поўныя твае крыніцы.
Падлеткам за чужою чарадой
Я выхадзіў выжары і пагоркі,
Ты быў прытулкам мне, маёй ядой,
вадой
І хлебам горкім.
Усё рада госцю. Цяжкія чмялі
Ля ног мітусяцца і падаюць ад стомы—
А ў верхавінні, у густым галлі —
Прыветлівы птушыны гоман.
Прывычна пальцы ходзяць па ладах,
Пяе вярба, паслушная падпаску,
І водгуллем далёкім у гадах
Вяртаецца нявызнаная ласка.

Май, 1939 г.

ПАВЕЛ ХАДАРЭНКА.

СЯСТРЫ

Сястра, ты помніш бераг той,
Дзе хвалі крута б'юць і пеняць,
Дзе лопух з жоўтай барадой
Стаіць, здаецца, на каленях.
На гэтым беразе калісь,
У даўні час, суровы, грозны
Мы слёзы ўпотай пралілі
Над трупам бацькі. Мора слёзаў...
Яго уланы прывялі
На бераг гэты. Ноч гарэла...
— Дзе партызаны? Гавары?
Не кажаш... Загрымелі стрэлы.
Атрад уланаў на канях
Далей паліць, страляць пакрочыў,
А мы з табой у лахманах
Пазналі лёс цяжкі, сірочы.

Уланаў з краю ўсіх прагналі.
Рукой бацькоўскай правадыр
На ногі нас з табой паставіў.
Сястра, ты помні бераг той,
Дзе хвалі крута б'юць і пеняць,
Дзе лопух з жоўтай барадой
Стаіць здаецца, на каленях.
Калі-ж над краем маладым
Навісне чорная трывога.
З табой на беразе крутым
Мы развітаемся... Дарогай
Пайду з атрадамі. Вады
Набраўшы флягу ў рэчцы бурнай,
Нам шлях пакажа правадыр
Праз кананады і віхуры.

З. ЦЯЛЕСІН.

БАБУЛЬЧЫНЫ РУКАВІЧКІ

Тут, на гэтай нізкай прызбе,
У час, калі вясна была,
Пэрла, родная бабулька,
Рукавічкі мне пляла.

Я сядзеў з бабулькай побач,
Вочка кожнае лічыў.
Казкі, былі, небыліцы
Вельмі слухаць я любіў:

Аб паўліне, аб царэўне,
І аб казачнай зямлі.
Дзе з барадамі, бы хмары,
Людзі дзіўныя жылі;

Аб старым над вірам млыне;
Слове жудасным — пагром;
І аб тым, як поўнаводдзем
Патануў на дно паром;

Як сям'ю згубіла птушка,
Сірацінаю жыла:
Сумавала, гаравала,
Долі шчаснай не знайшла.

Бабка казкі гаварыла
Мне на прызбе пад вакном
І, здаецца, ў рукавічкі
Заплятала іх прутком.

Рукавічкі-невялічкі
З малым пальчыкам былі.
Не было суконных нітак.
Дык з атрэп'я іх плялі.

Толькі вочкі чырванелі,
І прыемна так было
Адчуваць зімой сцюдзёнай
Іх пушыстае цяпло. —

Ці пайду капаць я гліну,
Каб замазаць ёю печ:
Ці пачну я секчы дровы
І складаць іх пад павець:

Ці з вядром іду да студні
Па крыштальную ваду;
Ці зімою неспакойнай
У дарогу я пайду;

Ці ў завею каля ганку
Стану сцежку размятаць;
Ці увечары карове.
Пачну сена падаваць.

Разглядалі рукавічкі
Усе таварышы, сябры.
Мне зайздросцілі ад сэрца,
Як каталіся з гары.

Над магілаю бабулькі
Дуб галіны апусціў.
Рукавічкі-невялічкі
Я даўным-даўно знасіў.

Я стаю ля той-жа прызбы
Днём марозным пад акном,
І ад блізкіх успамінаў
Вее ласкай і цяплом.

З яўрэйскай мовы пераклаў
А. БЯЛЕВІЧ.

Мастак І. О. Ахрэмчык працуе над фрызам для беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі на тэму: «Свята беларускага народа».

Фота Шышко.

„ДАРЭВОЛЮЦЫЙНАЯ І СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ У НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ“

Этнаграфічна-фальклорнай секцыяй інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР выдан зборнік фальклора «Дарэволюцыйная і Совецкая Беларусь у народнай творчасці».

Зборнік адкрываецца артыкулам тав. Грынблата «Творчасць беларускага народа». Назва вельмі салідная. Але змест артыкула не можа задаволіць чытача. Тав. Грынблат гаворыць пакрысе аб усім: аб дарэволюцыйнай і сучаснай Беларусі, аб жыцці беларускага народа, аб дарэволюцыйным і сучасным фальклоры, аб прыгожасці народнай творчасці і г. д. І ніводнага слова не сказаў аўтар аб тым, як геніі чалавецтва Маркс, Энгельс, Ленін і Сталін любоўна адносіліся да духоўнай творчасці народа, як высока яны ацэньвалі яе. А між тым, заўважым, гэты зборнік «прызначаецца, — як пішацца на першай старонцы, — для партыйных агітатараў і прапагандыстаў, для палітработнікаў і культработнікаў у прамысловасці і калгаснай вёсцы, для рабочых і калгасных клубаў, гурткоў самадзейнасці і для шырокай совецкай грамадскасці». Вось гэтым партыйным і беспартыйным бальшавікам-агітатарам і патрэбна было проста і ясна расказаць аб адносінах класікаў марксізма-ленінізма да фальклора, аб тым, як яны ў сваіх класічных працах выкарыстоўвалі народную творчасць.

Зусім абышоў тав. Грынблат класічныя выказванні аб фальклоры А. М. Горкага, які не раз адзначаў, што «пачатак мастацтва слова—у фальклоры». Горкі не раз звяртаў нашу ўвагу «на той факт, што найбольш глыбокія і яркія, мастацка-ўдасканаленыя тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю народа». Нарэшце, Горкі вучыў, што сапраўдную гісторыю працоўнага народа нельга ведаць, не ведаючы вуснай народнай творчасці.

Гаворачы аб гучнасці і страсным пафасе сучаснай творчасці беларускага народа, тав. Грынблат абмяжоўваецца пералікам вядомых усім фактаў і не паказвае той асновы, на якой вырастае сучасны фальклор. А такой асновай з'яўляюцца совецкі, соцыялістычны лад, новыя адносіны да працы, заможнае жыццё, створанае народам пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Пяройдзем да самога фальклорнага матэрыялу, змешчанага ў зборніку. Фальклорны матэрыял размеркаван тэматычна. Кожны раздзел зборніка мае сваю асноўную тэму, вакол якой згрупіраваны розныя па жанру матэрыялы народнай творчасці.

Але, чытаючы зборнік, бачыш, што большасць твораў вельмі знаёма, дзесьці, нават не так даўно, чытана. Аказваецца, у зборніках «Ленін і Сталін у беларускай народнай творчасці» і «Чырвоная армія і абарона радзімы ў беларускай народнай творчасці», выдадзеных у 1937—38 годах фальклорнай секцыяй інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, гэты матэрыял быў ужо ў значнай большасці надрукаван.

І толькі два раздзелы: «Пад панскім бізуном» і «У ярме капіталістычнай эксплаатацыі» — новыя ў гэтым выданні.

Нам хацелася-б бачыць у зборніку рознастайны і багаты матэрыял дарэволюцыйнага беларускага фальклору, хацелася-б ведаць, як беларускі працоўны народ апеў сваё змаганне супроць памешчыкаў і капіталістаў у часы першай рускай рэволюцыі 1905 года. Але і раздзелы «Пад панскім бізуном» і «У ярме капіталістычнай эксплаатацыі» даволі бедныя як па тэматыцы, так і па колькасці матэрыялаў. Безумоўна, нельга згадзіцца з той думкай, што дарэволюцыйны фальклор беларускага народа бедны. Не ў гэтым справа. А справа ў тым, што складальнікі зборніка не здолелі сабраць і надрукаваць самае лепшае і цікавае з народнай творчасці.

І таму зямельная рэформа 1861 года ў зборніку адзначаецца толькі невялічкай песняй «Адпусцілі сялян на свабоду», песняй, якая была запісана не толькі ў Беларусі, але ў многіх раёнах былой царскай Расіі. А 1905 год у зборніку не адлюстраван ніводным радком народнай творчасці. Мы ніяк не можам згадзіцца з тым, што рэволюцыя 1905 года не знайшла свайго адлюстравання ў беларускай народнай творчасці.

Рабочы фальклор, асабліва совецкі рабочы фальклор, у нас яшчэ мала даследаван і вывучан. І таму на збіранне рабочага фальклора, на яго публікацыю фальклорнай секцыі патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу. Зборнік-жа ў раздзеле «Беларусь індустрыяльная» дае толькі 27 строф частушак. Вось чаму ў чытача можа з'явіцца няправільная думка, што, акрамя частушак, совецкі рабочы фальклор іншых жанраў не мае.

Вельмі таямнічым для нас і для чытача з'яўляецца такая пашпартызацыя некаторага матэрыялу: «З архіва фальклорнай секцыі АН БССР». Наогул, пашпарт твораў, змешчаных у зборніку, нам здаецца, лепш было-б даваць не ў канцы кнігі, а пасля кожнага твору пасобку.

Народная творчасць павінна быць любоўна і ўмела сабрана і данесена да масавага чытача.

На нашу думку, Акадэміі навук патрэбна выдаць фундаментальныя зборнікі вуснай творчасці беларускага народа. У адным зборніку даць лепшы дарэволюцыйны фальклор, згрупіраваны па жанрах і тэмах, у другім—пасляРэволюцыйны, совецкі фальклор.

Агульным недахопам усіх зборнікаў народнай творчасці, якія выдадзены фальклорнай секцыяй Акадэміі навук БССР, з'яўляецца недастатковасць жанраў вуснай творчасці. Так, ва ўсіх зборніках змешчана вялікая колькасць частушак, іншыя-ж жанры народнай творчасці прадстаўлены надзвычай бедна.

М. КАРПАЧОЎ, Я. МІХАЛАП.

ЗАЎВАГІ АБ БЕЛАРУСКІМ ПРАВАПІСЕ

Дыскусія, якая вядзецца ў друку аб прынцыпе, які павінен быць пакладзен у аснову пры рэформе беларускага правапісу, дала станоўчы вынік. Большасць выступаўшых выказаліся за фанетычны прынцып.

І гэта зразумела. Беларускі правапіс фанетычны. Этымалагічны прынцып (оканне і еканне) не спрасціў-бы правапісу, не наблізіў-бы яго да жывой мовы беларускіх рабочых і сялян, а, наадварот, ускладніў-бы яго, зрабіўшы штучны бар'ер паміж беларускім вымаўленнем і пісьмом.

Ужо час пачаць дыскусію не аб прынцыпе стварэння новага правапісу, а аб тым, як і што у ім трэба змяніць, спрасціць, удакладніць.

На маю думку, неабходна спрасціць правапіс інтэрнацыянальна-рэволюцыйных слоў, шляхам увядзення частковага акання—перадачы ненаціскнога **о** праз **а**.

Прынцып нязменнасці **э**, **е**, як і ў словах іншамоўных, трэба, бясспрэчна, захаваць.

Гэта спрашчэнне зробіць палёгку ў тым сэнсе, што словы іншамоўныя і інтэрнацыянальна-рэволюцыйныя будуць пісацца па аднаму прынцыпу. Напрыклад: метадыст, дэмакрат, рэвалюцыя, пралетарый.

Неабходна ўдакладніць фармуліроўку правапісу **е** пасля націску:

«Пасля націску «е» пішацца ў аснове слова». Напрыклад: вецер, прынесеныя. Пры цяперашняй фармуліроўцы атрымліваецца, што «е» пасля націску пішацца заўсёды, г. зн. і ў канчатку. Напрыклад: не сінія, а сініе.

Трэба толькі зрабіць такую заўвагу аб выключэнні для правапісу дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў: «У дзеепрыметніках і дзеепрыслоўях, утвораных ад дзеясловаў, неазначальная форма якіх канчаецца на «яць», пасля націску і ў аснове слова пішацца «я». Напрыклад: пасеяць — пасеяны, пасеяўшы; развеяць—развеяны, развеяўшы».

У правапісе шыпячых і свісцячых (які, дарэчы сказаць, неабходна аднавіць у граматыцы) трэба ўнесці ўсе словы, у якіх падабенства свісцячых да шыпячых перадаецца на пісьме. Напрыклад: шчасце, рошчына, шчоты, шчотчык і г. д.

Фармуліроўку правапіса шыпячых і свісцячых на маю думку трэба запісаць так:

«Для таго, каб пазнаць, якую пісаць зычную, шыпячую ці свісцячую, трэба змяніць слова так, каб пасля невыразнай зычнай стала галосная». Гэта значыць, для правапісу глухіх і звонкіх, шыпячых і свісцячых даць адзін і той-жа крытэрый. Напрыклад; на рэчцы—рэчачка, у дзежцы—дзяжа, перапісчык—перапісаць. Выключэнні: у некаторых выпадках трэба знайсці корань слова. Напрыклад: аб'язджаць (язда). Корань слова—язд.

У словах вымыешся, знойдзешся, выкупаешся і ім падобных трэба адкінуць часціцу «ся». Пры гэтай умове «ш» вымаўляецца выразна.

У напісанні **і**, **й** (нескладовага) да гэтага часу існуе неразбярыха. Выклікана яна лёгкадумнай фармуліроўкай у граматыцы: «Пасля галосных **і** (складовае) пішацца тады, калі ўтварае самастойны склад (краіна, Украіна, гаі, трамваі)».

Інакш кажучы, «што чуецца, тое і пішацца». Гэта старая нацдэмаўская фармуліроўка нараджае такім чынам непісьменнасць.

Аднаму пачулася **й** (нескладовае), і ён піша: зайкацца, зайскрыцца і г. д. Другому пачулася і (складовае), і ён піша: заікацца, заіскрыцца і г. д. Усе гэтыя і ім падобныя словы засталіся па-за правапісам.

Трэба ўдакладніць фармуліроўку правапіса **й** (нескладовага). Напрыклад, так: «Нескладовае «й» пішацца пасля галоснага толькі ў сярэдзіне і ў канцы слова не пад націскам». Напрыклад: вайна, акрайна, ускрайна, край. Удакладніць фармуліроўку правапісу «і» (складовага) на маю думку трэба так: «складовае «і» пасля галоснага ў сярэдзіне і ў канцы слова пішацца тады, калі на яго падае націск». Напрыклад: краіна, гаі. Выключэнне: «Пасля прыставачнага галоснага перад збегам зычных, які пачынаецца санорным, захоўваецца «і» складовае не пад націскам».

Пасля прыставачнага галоснага перад зычным або перад збегам зычных, які пачынаецца іншымі зычнымі (не санорнымі) пісаць «й» (нескладовае). Напрыклад: зайкацца, зайскрыцца, найграць і г. д. Таксама захоўваецца «і» (складовае) не пад націскам у канцы слова, як канчатак назоўнікаў назоўнага, роднага, давальнага або меснага склонаў. Напрыклад: трамваі, лініі, аб рэволюцыі, на рэвалюцыі.

«Д» перадаваць цвёрда або мякка ў залежнасці ад вымаўлення ў іншай мове. Напрыклад: дзірэктар, дзіктатура, дзелегат. «Т» у пачатку і ў корані слова перадаецца цвёрда або мякка ў залежнасці ад вымаўлення ў іншай мове. Напрыклад: ціф, эпіцет, ціпаграфія, пацефон.

Суфіксальнае «т» перадаецца цвёрда. Напрыклад: камуністычны, сацыялістычны, рэалістычны. Выключэнне: у словах, даўно запазычаных з іншай мовы, «т» перадаецца цвёрда. Напрыклад, тып.

У правапісе мяккага знака і апострафа трэба агаварыць: «У вытворных словах пасля мяккіх свісцячых перад суфіксальным «м» пішацца мяккі знак. Напрыклад: васьмі, дзецьмі, людзьмі. Але—слязмі. Тут адзінае палажэнне мяккага «з». Ва ўсіх астатніх выпадках само «з» вымаўляецца цвёрда: слёзы, слязам, слязамі і г. д. Тое-ж, што ў словах: вясне—вясна, вясны; дзве—два, двух і г. д.

Для раздзельнага вымаўлення мяккага «л» з галоснай я, ё, ю і е пішацца мяккі знак. Напрыклад: Васільеў, Ільіч, рэльеф, лье, мільён. У словах-жа, якія запазычаны з іншых моў, пасля мяккага «д» для раздзельнага вымаўлення з галосным **я**, **ё**, **ю** і **е** пісаць мяккі знак.

У правапісе «в» прыстаўнога няма ніякай патрэбы грунтавацца на націску. Паколькі ва ўсіх беларускіх словах «в» прыстаўное пішацца перад «у» карэнным і ў пачатку і ў сярэдзіне слова, пад націскам і не пад націскам, значыць трэба пакласці ў прынцып напісання прыстаўнога «в» не вузкае, раздрабляючае паняцце націскаў, а больш шырокае і яснае, абагульняючае паняцце карэннага і прыставачнага «у».

Прыстаўное «в» трэба пісаць перад карэным «у» у пачатку слова і ў сярэдзіне слова тады, калі «у» стаіць пасля галоснага. Напрыклад: вучань, вучыцца, вужы, павуцінне, павук. Перад карэнным «у», якое стаіць пасля прыстаўкі, «в» прыстаўное трэба захаваць. Напрыклад: падвучыцца, навука.

Прыстаўное «г»—пісаць перад карэнным «э». Напрыклад: гэты, гэтакі, адгэтуль. У адным іншамоўным слове «гісторыя»—пісаць «г» прыстаўное перад пачатковым «і». Прыстаўное «а» пісаць у двух словах: аржаны, аўторак.

Зрабіць правапіс больш даступным і лёгкім для засваення—справа вялікага дзяржаўнага значэння, справа ўсёй совецкай грамадскасці.

С. ГРЫШЧУК.

Артыкул друкуецца ў парадку абмеркавання.

ХАЛОДНЫЯ ВЕРШЫ

Перад намі першы зборнік вершаў маладога паэта А. Ушакова «Голас радзімы». У зборніку змешчана 27 вершаў, датыраваных 1934—1937 гадамі.

Большасць вершаў Ушакова прысвечана: байцам рэспубліканскай арміі Іспаніі, совецкім пагранічнікам, парашутыстам, прызыўнікам. Тэмы не новыя. Але ўсякую, нават шмат разоў паўтораную тэму, можна распрацаваць своеасабліва, арыгінальна. На вялікі жаль, гэтага няма ў тав. Ушакова. Вершы яго ў пераважнай большасці напісаны суха, халодна.

Пагранічнік, баец у Ушакова абавязкова павінен «мацней напружыць зрок і слых», пасля ён «узвядзе на ўзвод затвор вінтоўкі» і «на свіст белагвардзейскіх куль адгукнецца вогненнай лавінай» («Песня пра пагранічніка»). Няўважлівы, павярхоўны падбор слоў, эпітэтаў прыводзіць Ушакова да нічым неапраўданых паўтораў. У адным толькі вершы «Прысяга» мы чытаем: «зеў агнявых зубоў», «Вогненная Даларэс», «камень гарыць агнём», «заклік агнявы», а сэрца, калі і не агнявое, дык усё-ж «пылаючае».

У вершах аб гераізме, дзе пачуцці павінны быць выяўлены найбольш скромна, простымі словамі, але так, каб чытач адчуваў пад гэтай скромнасцю, прастатой незвычайнае, Ушакоў ідзе па лініі найменшага супраціўлення. Ён не паказвае дзеянні свайго героя, а апісвае іх «гераічнымі» словамі. Напрыклад, замест дзейнага паказу рашучасці іспанскага лётчыка Прыето, аўтар проста рэгіструе факт: «рашуча ўступае ў бой». У другім вершы чытаем тое самае: «у рашучы бой уступай», «у рашучы бой вядзе».

Некаторыя радкі наогул нагадваюць першую пробу пяра дзіцяці: «буржуй, ужо блізка разлік з табой», «цягнуць ля машыны работы ярмо». Казённа і непераканаўча гучыць зварот аўтара да Даларэс Ібарури.

«Ты многа перацярпела,
Працуючы на паноў...»

У зборніку ёсць і нядрэнныя вершы. Адным з такіх з'яўляецца верш «Мужнасць». Дзея адбываецца ў Іспаніі. Патрэбна выканаць баявое заданне — узарваць мост.

Ці знойдзецца такі смяльчак
Хто смерць сустрэць гатовы?
Рашуча падыйшоў юнак
Мартынес з-пад Кардовы.

— Чужы збіраў я вінаград,
Касіў чужыя травы.
Цяпер хоць раз я буду рад,
Сваю выконваць справу!»

Мартынес бясстрашна выконвае адказнае і небяспечнае заданне.

У атрадзе —

«Над чорнай стромаю ракі,
Як дрэва выбух вырас.
І песня скончана. Такім
Героем быў Мартынес...»

У гэтым вершы знойдзены яркія дэталі. Слова герой — апраўдана. Пераканаўча паказана чытачу гераічнасць іспанца.

Добрае ўражанне пакідае лірычны верш «Дзе ты чорнавокая...» У ім, акрамя арыгінальна-закончанага зместу, вельмі ўдалая тэхнічная апрацоўка.

«Каля воднай станцыі
З песнямі і танцамі
Моладзь веселілася гурбой.
За цяністым паркам,
Дзе прастор байдаркам,
Там я пазнаёміўся з табой...»

Але нават у лепшых вершах Ушакова трапляюцца халодныя, сухія радкі.

Арк. ГЕЙНЕ.

2 ліпеня споўнілася 225 год з дня нараджэння нямецкага кампазітара Хрыстофа-Вільбальда Глюка.

На здымку Х.-В. Глюк.

КАНЦЭРТ МАГІЛЕЎСКАГА МУЗЫЧНАГА ВУЧЫЛІШЧА Ў МЕНСКУ

На базе старэйшай у БССР магілеўскай музычнай школы два годы назад было арганізавана музычнае вучылішча. 24 чэрвеня ў канцэртнай зале Кансерваторыі БССР адбылася творчая справаздача вучняў вучылішча.

Канцэрт пакінуў добрае ўражанне, ён паказаў наліччa ў магілеўскім музвучылішчы здольных вучняў. Канцэрт паказаў і тое, што педагагічны персанал магілеўскага музвучылішча ў асноўным правільна кіруе вучобай, выхаваннем малалых спецыялістаў.

Той факт, што магілеўскае музычнае вучылішча, самае маладое з усіх музвучылішч БССР, «адважылася» паказаць сваю работу ў Менску, заслугоўвае заахвочвання.

Буйнейшымі заганамі ў рабоце педагогаў магілеўскага музвучылішча, як паказвае праграма канцэрту і яе выкананне, з'яўляюцца: некаторая пераацэнка педагогамі сіл вучняў у галіне прапрацоўкі з імі твораў, якія па складанасці не адпавядаюць творчым магчымасцям вучняў, не зусім беражлівыя адносіны да музычнага тэкста, і, нарэшце, бесклапотнасць да падбору рэпертуару. Напрыклад, выконваліся такія антымастацкія творы, як «Песня аб Максіме» Галашчокіна.

Лепшае ўражанне, у параўнанні з другімі, пакінулі скрыпачы (клас педагога Еўстратава).

Гаворачы аб ўдзельніках канцэрта, неабходна адзначыць вучня класа педагога Боркуса піяніста Каганава, вучня класа педагога Радава віяланчэліста Каранеўскага, які валодае добрымі музычнымі і тэхнічнымі данымі, вучня Кіснера (труба, клас педагога Зісмана), які валодае добрым гукам, добрым дыханнем; вучня Пічкурова (скрыпка, клас Еўстратава). Ён паказаў у выкананні наліччa добрага густу. Вельмі ўдала выканала на фартэп'яна «З карнавала» Грыга вучаніца Мухіна (клас педагога Меркінай).

Сярод вакалістаў лепшае ўражанне пакінулі студэнты Мацэвіч і Казлова (клас педагога Міласлаўскага) і студэнтка Стаякова (клас педагога Егоравай). Ва ўсіх іх ёсць наліччa добрых вакальных даных.

Творчаму росту вучняў перашкаджае тое, што дагэтуль у Магілеве няма сімфанічнага аркестра, не наладжваюць канцэртаў. Самому вучылішчу часам даводзіцца выконваць функцыі канцэртнай арганізацыі і гэта адбіваецца на вучэбным працэсе.

І. НІСНЕВІЧ.

БУДАЎНІЦТВА ІНТЭРНАТА ТЭАТРАЛЬНАГА ВУЧЫЛІШЧА

Рэспубліканскае тэатральнае вучылішча ў новым навучальным годзе будзе мець 230 студэнтаў. Для забеспячэння студэнтаў агульным памяшканнем вучылішча будуе інтэрнат на 140 чалавек.

Згодна плана, будаўніцтва інтэрната павінна быць закончана 25 жніўня бягучага года. Аднак, недахоп будаўнічых матэрыялаў ставіць будаўніцтва пад пагрозу зрыва. Так, лесам будаўніцтва забяспечана толькі на 26 проц., дахавым жалезам на 15 проц., нехапае таксама 51 тоны цэменту, 13 з паловай тысяч штук чарапіцы і т. д.

З-за адсутнасці будаўнічых матэрыялаў тэхнічная гатоўнасць аб'екта на 25 чэрвеня складае толькі 55—60 проц.

Ад своечасовага сканчэння будаўніцтва інтэрната залежыць нармальная работа адзінага ў БССР тэатральнага вучылішча.

Дзяржплан БССР павінен забяспечыць будаўніцтва патрэбнымі будаўнічымі матэрыяламі і санітарна-тэхнічным абсталяваннем з тым, каб да пачатку навучальнага года інтэрнат быў здан у эксплаатацыю.

П.

Для дзяцей камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці БАВА арганізаван гурток па класу раяля.

На здымку: (злева направа): Эма Літвінава, Ніна Беленькая і Руфа Максімцаў рыхтуюцца да чарговых заняткаў гуртка.

Фотахроніка БЕЛТА.

СТВАРЫЦЬ СПЕКТАКЛІ АБ НАШАЙ РЭЧАІСНАСЦІ

У канцы 1939 года ў Маскве адбудзецца дэкада дзіцячых тэатраў. Дзіцячыя тэатры Саюза ССР прадэманструюць на дэкадзе свае творчыя поспехі.

У спіс удзельнікаў дэкады ўключан і Тэатр юнага гледача БССР.

Як тэатр рыхтуецца да дэкады?

Тэатр мае ў сваім рэпертуары рад цікавых спектакляў: «Як гартавалася сталь» па Н. Астроўскаму, «Годы выпрабаванняў» Е. Раймонд, «Блакітнае і ружовае» А. Бруштайн. Але дагэтуль тэатр не паказаў свайму гледачу ні адной арыгінальнай п'есы пра нашу школу, пра слаўны ленінска-сталінскі камсамол, пра цудоўнае сучаснае і яшчэ больш прыгожае будучае нашага юнацтва. Зараз тэатр працуе над пастаноўкай п'есы-казкі «Цудоўная дудка» В. Вольскага (пастаноўшчык — засл. арт. БССР Е. А. Міровіч), якая разлічана на дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту. Але і гэта п'еса аб мінулым.

Тэатру неабходна ўзбагаціць свой рэпертуар перш за ўсё п'есамі аб нашай рэчаіснасці. У гэтым павінны аказаць дапамогу пісьменнікі БССР. Ужо ўстаноўлена творчая сувязь з А. Якімовічам, які піша п'есу аб жыцці дзяцей на граніцы, і Я. Маўрам.

Апрача работы над арыгінальнымі творамі, Тэатр юнага гледача будзе працаваць і над лепшымі п'есамі пісьменнікаў братніх рэспублік. У рэпертуар уключана п'еса аб совецкай школе — «Брат героя» ордэнаносца Льва Касіля. Гэта п'еса пакажа нашаму гледачу ў яркіх мастацкіх вобразах соцыялістычную школу. Тэатр мяркуе ў гэтым годзе паказаць і спектакль па вядомаму твору Памялоўскага «Очерки бурсы».

Рост культурных запатрабаванняў гледача патрабуе ад тэатра павысіць мастацкі ўзровень, якасць спектакляў, змагацца супроць спрашчэнства, ачысціць свой рэпертуар ад малакаштоўных пастановак. Спектаклі для дзяцей па сваёй мастацкай якасці павінны быць на ўзроўні лепшых спектакляў нашых дзяржаўных тэатраў.

Упраўленню па справах мастацтваў і самому тэатру трэба клапатліва вырошчваць кадры, замацоўваць лепшых творчых работнікаў на сталую работу ў тэатры, ствараючы ім усе ўмовы для творчай работы і вучобы.

Значным недахопам у рабоце Тэатра юнага гледача з'яўляецца адсутнасць педагагічнай, выхаваўчай работы, якая мае вялікае значэнне ў фарміраванні мастацкага густу маленькіх гледачоў, у правільнай падрыхтоўцы іх да ўспрыняцця спектакляў. Перашкаджае творчай і масавай рабоце і неабсталяванае памяшканне тэатра. Даўно час памяшканне Тэатра юнага гледача зрабіць такім, каб вучні маглі ў ім культурна адпачываць.

Усю падрыхтоўчую работу да дэкады дзіцячых тэатраў СССР Тэатр юнага гледача БССР будзе весці ў цеснай сувязі з грамадскасцю, з сваімі гледачамі, змагаючыся за стварэнне такіх спектакляў, якія былі-б вартымі слаўнага імя Н. К. Крупскай, якое носіць тэатр.

Вл. СТЭЛЬМАХ.

ДВА КАНЦЭРТЫ

Першы канцэрт гомельскага музычнага вучылішча адкрыўся паказам сімфанічнага аркестра пад кіраваннем педагога М. А. Шэндэрава. Вялікае ўражанне пакінула выкананне хорам, у суправаджэнні сімфанічнага аркестра, «Песні аб Сталіне» кампазітара і выкладчыка вучылішча Г. К. Пукста. Добра былі выкананы уверцюра з оперы «Вяселле Фігаро» Моцарта, вальс з балета «Спячая красуня» Чайкоўскага і марш з оперы «Аіда» Вердзі.

Аркестр народных інструментаў пад кіраваннем выкладчыка С. В. Зорына, выконваў аранжыроўкі выпускнікоў вучылішча, а таксама творы класікаў. Добра прагучалі аранжыроўкі студэнтаў-выпускнікоў—Фішмана,—беларуская народная песня «Ой, зелена, зелена», Фалечыка—«Нас не чапай», Чэрнюгава—украінская народная песня «Засвістала казачэнкі» і інш. Хор пад кіраваннем педагога Г. К. Пукста выканаў з вялікім мастацкім густам «Яр Хмель» з оперы «Царская невеста» Рымскага-Корсакава, «Хмара» Мельнікава і хор з оперы «Паднятая цаліна» Дзяржынскага.

Індывідуальныя выступленні вучняў паказалі добрую работу спецыяльных класаў, добрыя музычныя здольнасці і музычную культуру. Вучаніца Позняк (лірыка-каларатурнае сапрана), якая выканала «Лугом зеляненькім» Пукста, «Цыганка» Даніцэці і «Што мне жыць і тужыць» Варламава, паказала ўменне музычнага выканання і добрыя галасавыя даныя. Не менш прыемнае ўражанне пакінула выступленне вучаніцы Матэцкай (мецца-сапрана), якая выканала хабанеру з оперы «Кармен» Бізэ і іспанскую песню Шышова. У яе выкананні гэтыя творы прагучалі свежа і абаяльна.

Надрэнныя галасавыя даныя паказалі вучаніцы Бурзакоўская (мецца-сапрана) і Шафраноўская (драматычнае сапрана), клас выкладчыка С. К. Вансецкай. Добра выконвалі музычныя творы на кларнеце вучань Емельянаў (канцэртына Вебера), клас выкладчыка В. М. Буданава, вучань Котлікаў (труба) «Варыяцыі» Мецдорфа, клас настаўніка Б. А. Фрыдмана, вучань Дамарацкі (баян)—вальс № 10 Шапена, клас настаўніка Л. К. Варушчэнка. Дасканалую тэхніку выканання на скрыпцы паказаў вучань Гофман, які выканаў імправізацыю Кабалеўскага.

Канцэрты 24 і 25 чэрвеня, дадзеныя музвучылішчам, паказалі грамадскасці Гомеля рэзультаты плённай і напружанай работы ўсяго калектыва па вырошчванню ўсебакова развітых музыкантаў-спецыялістаў.

Ал. ШАРШАТКІН.

Фестываль музыкі ў калгасах

10 ліпеня ва ўсіх абласцях БССР пачынаецца фестываль музыкі ў калгасах. Канцэрты адбудуцца на 15 пунктах (калгасах і раённых цэнтрах). На кожным пункце адбудзецца па тры канцэрты: два — сіламі прафесіяналаў, адзін— сіламі мастацкай самадзейнасці. Спецыяльныя канцэрты адбудуцца для дзяцей калгаснікаў.

У фестывалі прымуць удзел нар. арт. рэсп. Л. П. Александроўская, засл. арт. рэсп. Млодэк, Аляксеева, Балоцін і інш., ансамбль песні і пляскі і хор Белдзяржфілармоніі, дзве эстрадныя брыгады і артысты Опернага і Драматычнага тэатраў.

Пры Упраўленні па справах мастацтваў 3 ліпеня адбудзецца нарада, прысвечаная фестывалю. У бліжэйшыя дні з Менска ў калгасы выедуць інструктары і адміністратары для падрыхтоўкі і правядзення фестываля.

Семінары кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці

Віцебскі абласны Дом народнай творчасці правёў семінар кіраўнікоў драмгурткоў горада. Заняткі праводзіў рэжысёр рускага драмтэатра БССР тав. Міркін. На семінары былі прачытаны даклады аб майскім Пленуме ЦК ВКП(б) і аб міжнародным становішчы.

**
*

У першых лічбах ліпеня будзе праведзен семінар для 20 кіраўнікоў музычных гурткоў мастацкай самадзейнасці. У праграме семінара: лекцыі па гісторыі музыкі, пастаноўка голасу (для кіраўнікоў хора). Такія-ж семінары арганізуюцца і ў буйнейшых раённых цэнтрах вобласці.

Г. М.

Віцебск.

Павільён СССР на міжнароднай выстаўцы ў Нью-Іорку.

На здымку: «Мічурын сярод калгаснікаў», карціна мастака П. Котава.

НЕРАЗБЯРЫХА Ў АБЛАСНЫМ ДОМЕ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Партыя і ўрад нашай шчаслівай краіны аддаюць шмат увагі развіццю мастацкай творчасці ў СССР.

На ўсесаюзнай канферэнцыі рэжысёраў нам. старшыні СНК СССР тав. Вышынскі ў сваёй прамове сказаў: «... задача падтрымання, арганізацыі, дапамогі, кіраўніцтва тэатрамі самадзейнасці—не менш важная справа, чым кіраўніцтва тэатрамі прафесіянальнымі» і, далей, «тэатры самадзейнасці патрабуюць у максімальнай ступені кіраўніцтва—вядома, калі толькі паняцце «кіраваць» не зводзіць да таго, каб проста «вадзіць рукамі» («Правда», 15/VI-39 г.).

Але як-жа ўсвядомілі ўсё гэта тут, у Менску, абласны аддзел па справах мастацтваў і Дом народнай творчасці? Ці дапамагаюць яны тэатрам самадзейнасці?

Нажаль, кіраўніцтва абласнога аддзела і Дома народнай творчасці іменна звездзена да таго, што яны «водзяць рукамі». Узяць, напрыклад, такі факт. Пры Белдзяржтэатры існуе пракатная касцюмерная, якая абслугоўвае тэатры і гурткі самадзейнасці. Згодна загада па тэатру, касцюмерная да 10 чэрвеня г.г. павінна быць прынята абласным Домам народнай творчасці БССР (тав. Зелікавым), але апошні не жадае прымаць касцюмернай, матывіруючы тым, што ў абласным Доме народнай творчасці ёсць толькі 2 пакоі. Касцюмерную, па яго думцы, павінен прыняць рэспубліканскі Дом народнай творчасці, які мае 5 пакояў.

Рэспубліканскі-ж Дом народнай творчасці таксама адмаўляецца прымаць касцюмерную, лічачы яе «не сваёй справай».

Пакуль ідуць гэтыя міжведамственыя спрэчкі, Дзяржтэатр спыніў выдачу касцюмаў, пазбавіўшы, такім чынам, гурткі самадзейнасці магчымасці даваць пастаноўкі.

Так, 27 чэрвеня г.г. калектыў мастацкай самадзейнасці пры клубе імя Леніна, Зах. чыгункі, па ўказанню Палітаддзела абавязан быў пасля чыгуначнага вузлавога жаночага сходу паставіць спектакль. Але дырэкцыя Дзяржтэатра (тав. Алер) катэгарычна адмовіла выдаць напракат касцюмы.

На просьбу клуба выдаць касцюмы і не зрываць праграмы абласны аддзел па справах мастацтваў і Дом народнай творчасці развялі рукамі, не ведаючы, як быць. І толькі ўмяшацельства абкома партыі прымусіла Алера выдаць касцюмы. Прысутнічаючыя ў той час прадстаўнікі мастацкай самадзейнасці з дома адпачынку Ждановічы і Н-скай часці касцюмаў не атрымалі.

Хацелася-б ведаць, як доўга яшчэ будуць ісці міжведамственыя спрэчкі паміж абласным і рэспубліканскім Домам народнай творчасці аб прыёме касцюмернай і як доўга яшчэ тэатрам і гурткам мастацкай самадзейнасці прыдзецца «хадзіць па муках» у пошуках касцюмаў.

Д. ПАЧЭЧУЕЎ.

Кіраўнік гуртка клуба чыгуначнікаў імя Леніна.

ВЫСТАЎКА РАБОТ МАСТАКОЎ-САМАВУЧАК

Менскі абласны Дом народнай творчасці пачаў падрыхтоўку да выстаўкі работ мастакоў-самавучак, прысвечанай 22 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Адкрыццё выстаўкі мяркуецца 1 лістапада 1939 года.

«Гамлет» Шэкспіра ў Ленінградскім тэатры імя Ленсовета.

На здымку: Каралева Гертруда—арт. Е. Ф. Суйкоўская. Гамлет—арт. ордэнаносец Б. А. Смірноў.

АБ РЭЦЭНЗІЯХ „ГОМЕЛЬСКАЙ ПРАЎДЫ“

Прагдядзеўшы камплект газеты «Гомельская праўда» за бягучы год нельга не заўважыць занадта абмежаваную колькасць рэцэнзій на новыя кінофільмы і тэатральныя пастаноўкі.

Пераважная большасць рэцэнзій гэтай газеты падпісана М. Онегам.

Памянёны рэцэнзент ідзе па шляху найменшага супраціўлення. У яго нехапае смеласці сказаць аб той або іншай пастаноўцы свайго ўласнага ўражання, падмацаванага асабістымі доваламі.

Для прыкладу можна ўзяць яго рэцэнзію на кінофільм «Щорс». Уся рэцэнзія пабудована на адных агульных характарыстыках герояў фільма.

У рэцэнзіі на кінофільм «Сям'я Опенгейм» тав. Онег даходзіць зусім да падрабязнага пераказу зместа кнігі Л. Фейхтвангера. У выніку атрымліваецца не рэцэнзія, а звычайная «праграмка» для азнаямлення гледача з сюжэтам карціны. І толькі ў канцы рэцэнзіі аўтар піша:

«Некалькі слоў аб ігры актораў». Аднак нават гэтыя «некалькі слоў» з'яўляюцца сугуба-трафарэтнымі і ўжываюцца аўтарам без усякага пачуцця меры. Не задумваючыся, ён называе ігру кожнага актора «майстэрскай ігрой» або «удалым ізабражэннем».

Гэта, зразумела, самы бестурботны метад рэцэнзіравання. Хваліць можна ўсё без страху за сваю ўласную асобу, а выступаць з канкрэтнымі пытаннямі — небяспечна і «як-бы чаго не вышла...» Напэўна, тав. Онег і знаходзіцца ў такім становішчы, якое пасцігае часам рэцэнзента.

Падобна гэтаму гучыць і рэцэнзія тав. Х. аб цыркавых прадстаўленнях. Аўтар, згубіўшы лік пахвалам, беспрынцыпна ўвіхаецца вакол актораў, шчодра ўзнагароджваючы іх яркімі ярлычкамі, як-та: «Да майстэрства Ражновай прымяніма адно слова: шэдэўр — так дасканальна, ідэальна выконвае яна свой нумар». Тое-ж самае ён паўтарае і адносна другога актора цырка—жанглёра Бардзіловіча.

Правільна заключае аўтар, што «цыркавое мастацтва выхоўвае пачуццё смеласці, бадзёрасці...» Але якое пачуццё могуць выхаваць падобныя рэцэнзіі? — Гэта пытанне спрэчнае.

Тав. Сабаленка ў рэцэнзіі на пастаноўку «Пагібель воўка» спыняецца толькі на характарыстыцы літаратурных герояў Эд. Самуйлёнка. Атрымліваецца рэцэнзія не на спектакль, а толькі на п'есу.

Рэцэнзент І. Дорскі, пішучы аб засягненнях БДТ—2 абмяжоўваецца аднымі рытарычнымі разважаннямі.

Такі, напрыклад, сказ не дае чытачу ніякага ўяўлення аб пастаноўцы «Гібель эскадры» Карнейчука: «Гераічнае прыподнятае гучанне спектакля надало яму рамантычную ўсхваляванасць».

Амаль у такіх самых словах характарызуецца і пастаноўка «Мяшчане» Горкага: «Спектакль даў тэатру магчымасць яшчэ мацней стаць на шлях паглыбленай распрацоўкі вобразаў, выхоўваючы актораў у духу сапраўднага рэалістычнага мастацтва».

«Новы фільм (нават не ўказваецца які) — глыбокае апавяданне» — так пачынаецца рэцэнзія В. Розкіна на кінокарціну «На граніцы».

Далей, упамянуўшы пра «Казачнае багацце дзівоснага краю», аўтар піша «Дзівосна іграюць З. Фёдарава» і інш.

І заключэнне: «Рэжысёр Іваноў зрабіў дзівосны фільм...»

Вось такія «дзівосныя» у асноўным і ўсе рэцэнзіі, змешчаныя на старонках «Гомельскай праўды».

А. Г.

Фінальная сцэна спектакля «Ключы Берліна» у пастаноўцы тэатра імя Ленсовета.

На здымку (злева направа): паручык Карташоў—арт. Смірноў Б. А., Ігнацьеў—арт. Котаў Е. К., камендант Берліна — Закс А.

П'ЕСА АБ НОВЫХ ЛЮДЗЯХ

Значны час у нашай драматургіі наглядалася схільнасць да гістарычнай тэматыкі. У выніку з'явіліся п'есы аб вызваленчым руху беларускага народа з-пад іга паншчыны, аб рэволюцыйнай барацьбе рабочых, сялян і інтэлігенцыі супроць белапольскіх акупантаў.

У гэтым годзе на старонках часопіса «Полымя Рэволюцыі» пачалі таксама друкавацца п'есы рознастайнай тэматыкі і, нарэшце, з'явіліся драматургічныя творы аб сёнешнім жыцці совецкага народа. Да ліку апошніх трэба аднесці і п'есу «Пачэсны рэйс» Хв. Шынклера[*], прысвечаную людзям чыгуначнага транспарту.

Радуе тое, што аўтар імкнецца раскасаць аб вялікім пераломе, які адбыўся ў свядомасці совецкіх чыгуначнікаў за апошнія годы.

Пісьменнік не толькі вонкава паказвае барацьбу рабочых чыгуначнікаў за ўзорнае наладжванне работы дэпо, барацьбу супроць ворагаў-дыверсантаў, якія намагаюцца перашкодзіць развіццю совецкай чыгункі. Аўтар даводзіць, што трэба знішчыць шкодную недаацэнку нашых кадраў і спалучыць у адным аркестры маладых і старых рабочых, стварыўшы ім такія ўмовы, каб яны маглі найбольш плённа працаваць на карысць соцыялістычнай дзяржавы.

Вопытнага машыніста Сымона Вікенцьевіча Бірулю ворагі народа залічылі ў пенсіянеры. Біруля адчувае, што ў яго ёсць яшчэ дастаткова сілы. Ён кажа: «...машыну я добра ведаю, рукамі яе адчуваю, вухам чую».

Біруля не ные нават тады, калі апынуўся без працы. Ён часам бярэ свой куфэрак машыніста і ідзе ў дзяжурны пакой, каб дапамагчы таварышам у рабоце, даведацца аб іх поспехах. А іншы раз Біруля прыходзіць у дэпо з унукам Петрыкам, знаёміць унука з дэпо, з захапленнем тлумачыць яму сістэму паравозаў, чыгуначныя звычаі, хваліць сваю вузлавую станцыю.

З прыходам у дэпо новага парторга, Біруля вяртаецца на вытворчасць, на пасаду інструктара, каб перадаць свой шматгадовы вопыт маладым машыністам.

Характарыстыкай вобраза Бірулі могуць служыць яго словы: «Яна уедная, чыгунка гэтая. Ну, проста, жыцця без яе няма!» Так гаворыць патрыёт сваёй прафесіі — стары машыніст, які адчуў сваё месца ў грамадстве, а таму так выразна праяўляе любоў да соцыялістычнай працы.

Бірулю не зблытаеш са знаёмымі вобразамі беларускай літаратуры, напрыклад, з рамантычным машыністам Андрэем Лятуном з аднаіменнай аповесці М. Лынькова. Ён мае сваю біяграфію, свой характар, свае чалавечыя асаблівасці, якія ўласцівы людзям сталінскай эпохі. Досыць ярка паказана маральнае аблічча гэтага чалавека. — ён любіць дзяцей, паважае сваіх таварышоў па рабоце, уважлівы да моладзі. У яго характары ёсць падкупляючая дабрата, якая прыкметна выражана праз такія дэталі, як гасціннасць, частаванне рабочых табакай. Праз дробныя мастацкія дэталі Шынклер імкнецца намаляваць вобраз новага чалавека.

Вобраз Бірулі — у цэнтры п'есы, якая паказвае пачэсны рэйс маладога машыніста, вучня Бірулі, Цімафея Жадана, які выконвае заданне абароннага значэння.

Разам з гэтым адбываецца шкодніцтва ў дэпо і раненне Бірулі, арганізаванае, каб сарваць рэйс, начальнікам дэпо трацкістам Болгасам і завербаваным ворагамі Замылкам, па заданню польскага шпіёна-дыверсанта Квіенды, які маскіруецца пад маскай совецкага грамадзяніна — інспектара паравознай службы.

Разглядаючы гэтую частку сюжэту, некаторыя крытыкі могуць незадаволена адзначыць: зноў аб ворагах, старая тэма, яна надакучыла нашаму чытачу. Мы-ж сцвярджаем: кожная тэма добрая, яна толькі патрабуе своеасаблівага вырашэння.

Нам здаецца, што і драматург не думаў паўтараць вядомых ісцін адносна ліквідацыі ворага. Але пры паказе класавай барацьбы ён выкарыстоўвае нязначную групу вобразаў з варожага стану для супроцьстаўлення станоўчым персанажам, каб падкрэсліць інтэлектуальную перавагу совецкіх людзей перад ворагамі, каб зрабіць на гэтым супроцьстаўленні драматычны канфлікт.

Да паказу вобразаў ворагаў аўтар падышоў не трафарэтна — ён паказаў іх сілу і іх нікчэмнасць. Пісьменнік выявіў, як умела ворагі могуць вербаваць няўстойлівых людзей.

Квіенда кажа адносна заблытанасці біяграфіі Замылкі, што «дзе цьмянае— там мы павінны дзейнічаць». Сцэна размовы Квіенды і Замылкі напісана добра. У ёй адчуваецца валоданне пісьменнікам дыялогам, разуменне сутнасці драматургічнай напружанасці дзеі. Усе-ж астатнія сцэны з удзелам вобразаў ворагаў зроблены па прынцыпу знешняга дзеяння. Досыць складана акрэслена замаскіраванасць трацкіста Болгаса і хітрая таямнічасць польскага шпіёна Квіенды. Хаця ў дзеянні персанажаў гэтага лагеру ёсць некаторая схільнасць да дэтэктыва (5-я карціна). Пры ўсіх недахопах распрацоўкі гэтых вобразаў, дадатным трэба лічыць тое, што аўтар знайшоў пэўныя сітуацыі для таго, каб паказаць ворагаў у дзеянні.

У менш выгоднае становішча паставіў пісьменнік сваіх станоўчых герояў. Сымону Бірулю ў тэксце дадзена поўная характарыстыка. Але ён не паказан у дзеянні. Ён чытае «лекцыю» Петрыку аб дэпо, «натацыю» Жадану адносна «бархатнай» язды, размаўляе з Грамовічам і іншымі героямі. Нават перадача вопыту ў дзеянні нідзе не паказана. Таму вобраз Жадана, аб якім шмат гаворыцца ў п'есе, застаецца мала вядомым, а перадача вопыту аказваецца толькі ідэяй.

Усе станоўчыя персанажы характарызуюць адзін аднаго ў размовах паміж сабою. Іншы раз аўтар хоча штучна стварыць дзеянне. Напрыклад, у першай карціне напісана масавая сцэна для паказу адносін рабочых да Бірулі, але гэта сцэна не апраўдвацца далейшым ходам падзей. Масавыя сцэны і ў іншых месцах п'есы аўтарам пабудаваны няўдала. Гэта — публіцыстычныя месцы п'есы, якія пазбаўлены драматычных элементаў і не рухаюць дзею наперад.

Аўтар паказвае сям'ю совецкага чыгуначніка. І робіць ён гэта з веданнем сваёй справы. У доме старога машыніста адбываюцца цікавыя падзеі — выражаюцца кардынальныя пытанні паляпшэння работы дэпо. Да Бірулі прыходзяць малады парторг Грамовіч, які па сутнасці вучыцца ў вопытнага чыгуначніка, малады машыніст Семячка, напарнік Жадана, і стары пенсіянер Міхей Макаравіч Мішур. Узяты цікавыя персанажы, але яны часам амаль не да месца ў п'есе, бо яны не дапамагаюць разгортванню дзеі твора. Мы разумеем, напрыклад, што праз Семячку аўтар хацеў абвергнуць пачуццё зайздрасці, сцвярджаючы думку аб дружнай калектыўнай працы пры ўзаемнай дапамозе, што забяспечвае вытворчыя поспехі. Мы бачым імкненне аўтара больш глыбока паказаць асяроддзе чыгуначнікаў. У вобразах Семячкі і Мішура аўтар паказвае, што нават чэсныя совецкія людзі маюць некаторыя перажыткі мінулага, якія трэба вынараняць.

У бытавых сцэнах ёсць натуралістычныя мясціны, надзвычай доўгія размовы (4-я карціна). Напрыклад, уведзена байка пра ката, якая да п'есы, як і да той сцэны, у якую ўпісаў яе аўтар, ніякага дачынення не мае. Гэтыя недахопы тлумачацца нявопытнасцю пісьменніка, які ў першы раз выступае ў ролі драматурга. Трэба больш строга адбіраць матэрыял. У адной п'есе аб усім рознастайным совецкім жыцці не раскажаш.

Значнае месца ў п'есе займаюць члены сям'і Бірулі: унукі Петрык, Валя і жонка Ганна Паўлаўна. Сцэны з удзелам дзяцей напісаны жывой мовай, з адчуваннем дзіцячай псіхалогіі, з пачуццём лёгкага гумару. Фігура Петрыка абмалявана ў п'есе даволі поўна. Аўтар нават супроцьстаўляе шчырага Петрыка Замылку, які баіцца расказаць аб сабе праўду. Валя не ўключана ў канву сюжэта. Але гэта добры вобраз дзяўчынкі-лятуценніцы, якая марыць стаць хетагураўкай. І мары яе здзейсняюцца.

Вобраз клапатлівай жанчыны Ганны Паўлаўны цікава выпісан аўтарам. Аўтарам трапна знойдзена і яе месца ў п'есе.

Асноўная думка п'есы выказана словамі Грамовіча: «Усе харошыя мары ў нашай краіне здзейсняюцца». І гэта аўтар давёў. Для таго, каб наладзіць работу буйнай вузлавой станцыі, спатрэбілася аб'яднанне сіл маладых і старых машыністаў. Адзінай сям'ёй яны здолелі перамагчы ворагаў і выканаць пачэсны рэйс, дапамагчы нашай Чырвонай Арміі.

Аўтар узяўся за ўдзячную справу, імкнучыся паказаць совецкіх людзей трох пакаленняў — дзяцей, моладзь і старыкоў, ускрыць іх багатыя інтэлектуальныя якасці. Але ён зрабіў толькі палову работы, даў толькі накіды гэтых вобразаў, не здолеўшы яшчэ іх аб'яднаць адзіным драматургічным стрыжнем сюжэта.

Аўтар вынес п'есу на грамадскае абмеркаванне чытачоў, атрымаў ад іх заўвагі і мабыць прышоў да вываду: п'еса дрэнна арганізавана драматургічна, у ёй шмат лішняга, трэба зрабіць сюжэт больш ясным, дапрацаваць вобразы маладых машыністаў. Самае-ж галоўнае: дзейныя асобы павінны дзейнічаць, а не размаўляць доўга, а іншы раз, і дакучліва, для гэтага неабходна ад апавядальнага дыялага перайсці да драматургічнага.

Калі аўтар гэта зразумеў, дык яму варта дапрацаваць п'есу.

А. ЕСАКОЎ.

[*] «Полымя Рэволюцыі» № 4, 1939 г. Хв. Шынклер — «Пачэсны рэйс», п'еса ў 4 актах, 8 карцінах.

На залiках у Дзяржаўнай Беларускай кансерваторыі.

На здымку: выдатнік кансерваторыі па класу скрыпкі дацэнта Жоленц А. тав. Ахраменка П. Ф. здае залік. Залік прымаюць (злева направа) педагогі: Беневускі, Крук, дацэнт Орлоў, дацэнт Жоленц, засл. дзеяч маст. праф. Панавіцкі, лаурэат усесаюзнага конкурса скрыпачоў—дацэнт Амітон, Фідлэн, засл. арт рэсп. дацэнт Бесмертны, дацэнт Салочэнка.

Фота І. Каплінскага.

ГАЗЕТА ВЫХОЎВАЕ МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Газета «Комунар Магілеўшчыны» шмат увагі аддае літаратурнай справе: яна абядноўвае вакол сябе і выхоўвае дзесяткі маладых паэтаў, празаікаў і крытыкаў. Вясною гэтага года рэдакцыя сумесна з Саюзам пісьменнікаў правяла абласную нараду пачынаючых пісьменнікаў. Нарада прайшла з вялікім поспехам і прынесла значную карысць. Цікава адзначыць, што на гэтай нарадзе ўдзельнічала не толькі моладзь, але і прадстаўнікі старога пакалення. Малапісьменны стары чыгуначнік т. Багдановіч чытаў тут моладзі прасякнутыя глыбокай лірычнасцю і непасрэднасцю свае вершы-песні, прысвечаныя таварышу Сталіну, песні пра нашае шчаслівае жыццё. Тав. Багдановіч пачаў пісаць у апошнія годы. Такія акыны ў нашай краіне выяўляюцца і растуць з кожным днём. Ім трэба дапамагаць, акружыць іх увагаю, бо сярод іх ёсць безумоўна вялікія таленты.

Газета «Комунар Магілеўшчыны» робіць вялікую справу, рэгулярна змяшчаючы асобныя творы пачынаючых пісьменнікаў і асобныя літаратурныя старонкі.

У маі ў «Комунары Магілеўшчыны» надрукавана апавяданне маладога празаіка Я. Шчарбатава і выпушчана асобная літаратурная старонка ў № 118. На гэтых матэрыялах мы і хочам спыніцца.

У сваім апавяданні «Сустрэча» тав. Шчарбатаў цікава паказвае сустрэчу сына з маткай пасля 23 год разлукі. Маці-рэвалюцыянерка страціла сына, калі яму было ўсяго чатыры годы. Яна нічога аб ім не ведала, і сын не ведаў нічога пра маці. І вось праз шмат год малады настаўнік выпадкова знаходзіць сваю маці. Тэма глыбока лірычная, хвалюючая. Але апавяданне напісана няроўна, не зусім пераканаўча паказана гэта сустрэча пасля разлукі. Развязка зацягнута; аўтар штучна адцягвае развязку, не знаходзячы для гэтага грунтоўных матываў.

Другі празаік, тав. Ражкоў, у апавяданні «Шлях гібелі» расказвае пра гібель пірацкай фашысцкай падводнай лодкі, якая хацела патапіць флагманскі карабль у часе манеўраў. Трэба сказаць, што тав. Ражкоў нядрэнна справіўся з гэтай тэмай. Ён выявіў пэўнае веданне матэрыяла, на якім пабудавана апавяданне. Апавяданне чытаецца з цікавасцю. Праўда, мы не адчуваем тут уласнага голасу маладога празаіка, але гэтага і патрабаваць нельга. Можна было-б адзначыць і цэлы рад дробных апісак, няправільных сказаў («яны ішлі супроць характва»), аднак гэта не псуе агульнага ўражання ад апавядання.

У літстаронцы змешчана сем вершаў. З іх звяртаюць на сябе ўвагу ў першую чаргу вершы «Летні дождж» П. Бядуліна і «Развітанне» А. Проніна.

П. Бядулін смела шукае свайго ўласнага свежага вобраза. Нельга прайсці міма такіх радкоў:

«Трашчаць зямлі старыя плечы,
З яе грудзей выходзіць дым.
А напаіць зямлю то нечым —
Ёй неба не дае вады.

Трэба толькі пажадаць, каб гэтыя свежыя, яркія вобразы былі яснымі, простымі ў сваёй аснове, бо не зусім ясны вобраз «ідзе, як наша маладосць, купчасты дождж». Ён не дасягае сваёй мэты.

Тав. Пронін напісаў добры лірычны верш пра першае каханне.

Верш тав. Сідорына таксама прысвечан тэме кахання. Шкада толькі, што тав. Сідорын без патрэбы імкнецца абставіць тэму такімі радкамі, як «забыла свайго трактарыста», або «можа песню сябровак пайшла падтрымаць». Ад гэтага верш шмат траціць.

У форме верша тав. Л. Хаміцкага адчуваецца ўплыў «Кургана» Я. Купалы. Нельга сказаць, каб ён удала выкарыстаў запазычаную форму. Па зместу верш атрымаўся павярхоўны, неперакана ўчы. У невялікім вершы аўтар хоча паказаць дзве эпохі і рост чалавека ад пастушка кулацкіх кароў да цяперашняга пілота. Такая тэма ніяк не можа ўмясціцца ў маленькі лірычны верш. Яна хутчэй падыходзіць да эпічнага твору.

Вершу тав. П. Прыходзька не даў яркай думкі, якая-б стала асноваю твора. Тут шмат дэкларацыйнага. Паэт абяцае праспяваць песню, а самой вось песні і няма. Тое-ж самае можна сказаць і пра верш тав. А. Чэхоўскага.

У Н. Гарулёва верш не даведзен да канца. Ён залішне малы для такой вялікай тэмы. Тэма верша — даклад тава рыша Сталіна—вельмі канкрэтная і хвалюючая.

Апрача гэтых твораў, у літстаронцы змешчан артыкул крытыка Я. Тарасава «Літаратурны журнал у школе». У сваім артыкуле тав. Тарасаў робіць досыць грунтоўны агляд літаратурнага школьнага журнала «Совецкі школьнік» № 1, выпушчанага вучнямі 11 сярэдняй школы гор. Магілева.

Настаўнік тав. Гарбачоў паведамляе ў заметцы пра работу арганізаванага ў калгасе літгуртка.

Наогул-жа літаратурная старонка ў газеце «Комунар Магілеўшчыны» пакідае добрае ўражанне.

А. ЯКІМОВІЧ.

Ласы кот

(Байка)

Два браты — Іван з Кандратам
Мелі поплеч свае хаты.
У Іванавай кватэры
Жыў-быў кот,—вялікі, шэры.
Ласаваўся ён мышамі.
Пад падлогаю, у яме,
Ці пад шафай, ці пад печчу,
Ці ў кублах, ці пад страхою—
Ён душыў іх і калечыў,—
Не даваў мышам спакою.
Трапіў кот на двор Кандрата.
Там заўважылі рэбяты,
Як ён ціха праз плот краўся.
Хутка шэрага злавілі
І прывабна накармілі,
Бо ён хлопцам спадабаўся.
Кот ім кляўся ад душы
Усіх мышэй перадушыць:
— Я паспею там і тут,
Перагледжу кожны кут,
І Кандрату, і Івану
Службу верна несці стану.
Шмат кату работы стала,
Завіхаўся ён нямала:
У Кандрата смачна снедаў,
У Івана ён абедаў,
Кожны раз пасля вячэры
Ён прасіўся ўміг за дзверы,
Як-бы йшоў лавіць мышэй,
Выбіраў, дзе кут цяплей,
І храпеў ажно да рання,
Покуль зноў дадуць сняданне.
Так і жыў сабе пакрыху.
А з мышамі проста ліха —
І ў кладовай, і ў кватэры
Разгуляліся без меры,
Ажно пыл стаўбом клубіцца.
Калі-ж хто пачне дзівіцца
І ў ката аб тым спытае,
Кот адказ заўсёды мае.
Тут спытай—
— «Я там працую»,—
Мігам ён адрапартуе.
Там спытаеш — і адразу
Ты чакай таго-ж адказу...

***

Сумяшчальнік зачастую
Любіць мець нагрузак многа:
Хоць не робіць ён нічога,
А крычыць: «Я шмат працую!»

Л. КРУЦІЛАЎ, Я. АЎТУШКОЎ.

ЗЯМЛЯ

Ці выйду ў поўдзень яснавокі,
Ці выйду вечарам гуляць —
Мне ўсміхаецца шырокая,
Мая вялікая зямля.

Зямля!
Успомніць табе варта,
Якою ты была калісь:
Таптал і войскі Банапарта
Твае жытнёвыя палі;

Былі тут дні цямней за ночы,
Народ ад катаў твой стагнаў;
Сурова кайзер з войскам крочыў,
Хадзіла лютая вайна.

Але мінула непагода,
Дзе град свінцовы пагуляў.
Ты заквітнела шчасцем горда,
Мая цудоўная зямля!

Ты сонцам ясным абагрэта,
Зарой расквечана з Крэмля,
Радзіма радасці і кветак,
Багаццяў поўная зямля.

Дзе быў палын—аўсы ўзрастаюць,
Растуць буйныя ячмяні.
Люблю, зямля ты маладая,
Прастор тваіх шырокіх ніў;

Люблю цябе, зямля Советаў,
Твае зялёныя сады —
І ўвосень познюю і летам,
І ў дождж, і ў месяц малады.

Калі-ж праклятыя фашысты
Вайны раздзьмухаюць агні,
Пайду на заклік я гарніста
Твае палеткі бараніць!

Аляксандр ПАРМОН

ГАСТРОЛЬНАЯ ПАЕЗДКА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ

Пасля паспяховай гастрольнай паездкі па Узбекскай ССР, ансамбль беларускай песні і пляскі Дзяржфілармоніі даў рад канцэртаў у парках культуры і адпачынку гор. Менска, у піянерскіх лагерах, пагранчасцях, у часцях менскага гарнізона і інш.

29 чэрвеня ансамбль пачаў гастрольную паездку па раёнах БССР. Ансамбль наведае Асіпавічы, Старыя Дарогі Слуцк і Гомель. З 10 па 18 ліпеня ансамбль уключыцца ў фестываль музыкі ў калгасах і дасць 6 канцэртаў у Гомельскай і Палескай абласцях.

ПРАВЕРКА ЯКАСЦІ МАНУМЕНТАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ

У радзе гарадоў і раённых цэнтраў пастаўлены без санкцыі Упраўлення па справах мастацтваў помнікі. Многія з гэтых помнікаў выкананы дрэнна.

Упраўленне па справах мастацтваў прапанавала сваім абласным аддзелам праверыць мастацкую якасць манументальных твораў і абмеркаваць вынікі гэтай праверкі ў партыйных і совецкіх арганізацыях з тым, каб прыняць захады да замены ўсіх антымастацкіх помнікаў сапраўднымі творамі мастацтва.

«Недарасль» Д. Фонвізіна ў Ленінградскім тэатры імя Ленсовета.

На здымку (злева): Старадум—арт. Г. С. Гурэвіч, Соф'я—арт. Владзімірава. Справа: Прастакова—арт. Н. В. Фадсек, Мітрафан—арт. Н. Н. Глаголеў.

Фота І. Каплінскага.

Кадр з фільма «Сарачынская ярмарка»

„САРАЧЫНСКАЯ ЯРМАРКА“

(Фільм Кіеўскай кіностудыі)

Шлях рэжысёра Экка ў кіно — шлях смелага наватара ў галіне творчага асваення навейшых дасягненняў кінотэхнікі. У свой час «Пуцёўка ў жыццё» была першай мастацка-гукавой карцінай, «Салавей-саловушка» і «Сарачынская ярмарка» — першыя мастацка-каляровыя карціны ў совецкім кіно. Чуццё мастака правільна падказала выбар «Сарачынскай ярмаркі» аб'ектам стварэння лірычнай каляровай кінокамедыі.

Лірычнае хараство пейзажаў, мяккія тоны палтаўскай начы, бурнае багацце фарбаў у горах яблыкаў, груш, сліў, памідораў і дыняў на кірмашовых вазах у Сарачынцах — усё гэта давала бліскучую магчымасць разгарнуць перад гледачом на экране вельмі багаты феерверк колераў і фарбаў. Але ў выяўленчых сродках Гогаля вонкавыя фарбы былі строга падпарадкаваны задачам унутранай, не менш красачнай, абмалёўкі герояў. Паэтызацыя прыроды ў яго рэдка была адарвана ад паэтычнага свету ствараемых вобразаў.

Народны гумар Гогаля быў такім-жа задушэўным і красачным, як сама украінская прырода.

Калі не зразумець гэтага вельмі тонкага ўзаемапранікнення прыроды і чалавека ў творчасці Гогаля—наўрад ці варта браць на сябе смеласць пераказваць творы класікаў мовай іншай галіны мастацтва. Гэту смеласць узяў на сябе рэжысёр Экк.

У фільме адчуваецца спроба зліць у адно унутраныя і вонкавыя фарбы жыцця і вобразаў. Тым не менш аповесць Гогаля на экране і ў першакрыніцы — далёка не родныя сёстры. Усім вядома, што сапраўдны твор мастацтва заўсёды вылучаецца пачуццём меры. Страта вось гэтага пачуцця і адбілася на паказе гогалеўскіх вобразаў у карціне.

З самага пачатку фільма рэжысёр нібы паставіў сабе мэтай дагаварваць да канца ўсё тое, што вялікі класік пакідаў для ўяўлення чытача. Калі кум Цыбуля таўсты, дык ледзь не ў тры абхваты, калі Хіўра проста злая мачыха, дык у Экка яна зрабілася ўвасабленнем зла ўсяго свету, слых аб чорце на кірмашы ператварыўся ў панічны ўцёк чалавечых натоўпаў. Бяскрыўдны украінскі гапак вырастае ў кордэбалет і г. д. А ўстаўленыя эпізоды з Петрушкам і цыганкамі сталі вельмі даўгімі дывертысментамі, якія надоўга адцягваюць рэжысёра, а за ім і гледача ад асноўных вобразаў і тэмы фільма. Там дзе ў Гогаля лёгкая іранічная ўсмешка — у Экка гратэск. Ці-ж у такой лубачна-гратэскавай манеры ўспрымаецца ў аповесці любоўная сцэна Поповіча і Хіўры, як гэта зроблена ў карціне? Ці-ж такім аператачным прастаком у шырокіх украінскіх штанах апісан Гогалем Салопій Чэравік? І нарэшце, ці-ж падобна любоўнае тамленне Грыцко і Парасі, у Гогаля поўнае светлай паэтычнай прастаты, на халодныя погляды і абдымкі гэтых герояў у карціне?

Усе яны, узятыя разам і паасобку, пакідаюць уражанне аджыўшых танных лубачных ілюстрацый, якія ўпрыгожвалі некалі кнігі Гогаля.

У сапраўднасці-ж гогалеўскія вобразы не мелі нічога агульнага з гэтай псеўданароднай алеаграфіяй.

Чуццём вялікага мастака-рэаліста Гогаль заўсёды ўмеў утрымліваць свае вобразы на грані жыццёвага падабенства і таму яны ярка ажываюць ва ўяўленні чытача.

У карціне-ж гэтыя грані сцёрты.

У адным толькі захавана пачуццё меры ў карціне — у перадачы колераў і фарб. Калі «Салавей-саловушка» стамляе багаццем рэзкіх яркіх фарбаў, — дык тут усё ўзята на некалькі тонаў ніжэй. Амаль увесь фільм пабудаван на мяккіх поўтонах. Тактычнае і эканомнае размеркаванне гамм колераў не раздражняе, не стамляе глядача. У гэтай карціне колер ужо не самамэта для любавання, а сродак для больш глыбокага ўспрыняцця вобраза. Колеры і фарбы падпарадкаваны мастацкаму замыслу.

Калі Экк і далей пойдзе па гэтаму шляху, дык у бліжэйшы час совецкая кінематаграфія ўзбагаціцца яшчэ адным вельмі моцным элементам мастацкага ўздзеяння—колерам.

К. ГУБАРЭВІЧ.

Усесаюзны конкурс самадзейных музыкантаў

У мэтах шырокай папулярызацыі майстэрства выканаўцаў на народных музычных інструментах і выяўлення таленавітых музыкантаў Камітэт па справах мастацтваў пры СНК СССР арганізуе ў верасні першы ўсесаюзны агляд выканаўцаў на народных інструментах.

Першы тур па БССР будзе праведзен у Менску, другі і трэці туры ў Маскве.

У склад аргкамітэта конкурса ўвайшоў кіраўнік беларускага ансамбля народных інструментаў Белрадыёкамітэта Г. Ф. Самохін.

КАНЦЭРТНАЯ БРЫГАДА НА ДАЛЁКІ ЎСХОД

30 чэрвеня брыгада Маскоўскай кансерваторыі выехала на Далёкі Ўсход для абслугоўвання часцей Чырвонай Арміі. У складзе брыгады—выхавальнік Маскоўскай кансерваторыі, дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, лаурэат усесаюзнага конкурса скрыпачоў і віялančэлістаў А. Н. Амітон. Паездка працягнецца 45 дзён.

А. ЛЕБЕДЗЕЎ

СЛАВУТЫ РУСКІ БАТАЛЬНЫ ЖЫВАПІСЕЦ

Трыццаць пяць год назад, у часе руска-японскай вайны, загінуў вядомы рускі мастак-баталіст — В. В. Верашчагін. Ён загінуў, знаходзячыся разам з адміралам Макаравым на борце флагманскага карабля «Петрапаўлоўск». Матрос, які выратаваўся з карабля, расказваў пасля, што ён бачыў Верашчагіна, які спакойна замалёўваў сцэну боя ў момант, калі карабель пачаў ужо тануць. Мастак не раз на працягу жыцця сустракаўся са смяротнай небяспекай, каб толькі адлюстраваць на палатне праўдзівую карціну вайны.

Пачуццё глыбокай павагі да мастака ўзнікае ў кожнага, хто знаёміцца з працамі і жыццёвым шляхам Верашчагіна. Мастак усё жыццё нястомна вандраваў, прымаў удзел у войнах, падвяргаўся небяспекам бою.

«Даць,—гаварыў Верашчагін, — грамадству карціну сапраўднай, непадзельнай вайны нельга, гледзячы на сражэнне ў бінокль з прыгожай далечы, а трэба самому ўсё прачуць і прарабіць, удзельнічаць у атаках, штурмах, перамогах, паражэннях, перажыць голад, хваробы, раны. Трэба не баяцца ахвяраваць сваёй крывёю, сваім мясам, інакш карціны мае будуць не тое».

Не простая цікаўнасць штурхала Верашчагіна ў бой. «Грамадзянскі доўг» мастака, які любіў свой народ, жадаў паказаць яму з выключнай праўдзівасцю язвы грамадскага парадку, штурхаў Верашчагіна на ўдзел у самых безразважліва-смелых ваенных экспедыцыях. Выключная храбрасць і мужнасць выдатнага мастака вайны, агністага публіцыста здзіўляла яго сучаснікаў.

Верашчагін — не халодны, бяздушны «пратакаліст», як сцвярджаў А. Бенуа, а страсны, глыбока ідэйны, горача любячы народ мастак-публіцыст. Асноўнай ідэяй творчасці Верашчагіна была барацьба сродкамі мастацтва з захватніцкімі войнамі.

«Прысвячаецца ўсім вялікім заваявальнікам: мінулым, сучасным і будучым».— напісаў Верашчагін пад адной з сваіх лепшых карцін — пад карцінай «Апафеоз вайны». У гэтых словах — цэлая праграма творчасці.

Не арэолам велічы, не павагай акружаў Верашчагін захватчыкаў, імперыялістаў, інтэрвентаў. Піраміда з чарапоў — вось той адзіны сімвалічны помнік, які мастак лічыў магчымым паставіць у гонар заваявальнікаў-імперыялістаў.

Змагаючыся з захватніцкімі войнамі, выкрываючы заваявальнікаў—ад Тамерлана да прынца Уэльскага, ад Напалеона да Аляксандра II, Верашчагін у сваіх карцінах аб вайне паказваў раненых і забітых, пакалечаных і замёрзшых людзей там, дзе трыумфальныя баталісты паказвалі толькі трыумфы і перамогі ініцыятараў і арганізатараў захватніцкай бойні. Таму назва «батальнага жывапісца» у старым разуменні не прыстасоўваецца да Верашчагіна. Батальны жывапіс да Верашчагіна бачыў галоўную задачу ў тым, каб «апець» вайну, увекавечыць фігуру таго ці іншага царственага палкаводца, напісаць бой у выглядзе ўрачыстай, параднай, да прэзелаў тэатралізаванай сцэны.

«Мы ўсё яшчэ не можам вызваліцца ад таго сярэдневяковага прадрассудку, — крытыкаваў Верашчагін сучасны яму батальны жывапіс, — што мастак павінен абавязкова каго-небудзь ці што-небудзь праслаўляць». Верашчагін паказаў «будні» вайны. Ён адлюстраваў на палатне пакуты і мучэнні, якім падвяргаецца народ ва ўмовах феадальнай і капіталістычнай рэчаіснасці.

У сваіх карцінах мастак выкрываў існуючае ў эксплаататарскім грамадстве бязлітаснае знішчэнне «непакорных» у інтарэсах пануючай вярхушкі («Пакаранне першамартаўцаў у Расіі», «Рымскае пакаранне»). Прыгнёт капіталістаў, іх тэрор супроць пераможаных і ашуканых каланіяльных народаў з вялікай сілай і пераканаўчасцю выкрывае выдатны баталіст у карцінах «Англійскае пакаранне ў Індыі» і «Працэсія туземных і англійскіх улад у Дэлі». Зверская расправа інтэрвентаў над рускім народам паказана мастаком у «Расстрэле падпальшчыкаў» і «Са зброяй у руках! — Расстраляць». Гераізм, смеласць і мужнасць рускага народа, адстойваючага сваю незалежнасць перад захватчыкамі-чужаземцамі, адлюстраваны ў «Не займай, дай падыйсці!» і ў многіх іншых творах.

Храбрасць і гераізм рускага салдата, яго бліскучыя ваенныя якасці праўдзіва адлюстраваны Верашчагіным у «Акружылі — праследуюць», у «Парламенцёрах» і іншых работах. Яшчэ Стасаў справядліва адзначыў, што Верашчагін у сваіх палотнах таленавіта перадаў унутраны, сапраўды багатырскі характар рускага народа, адстойваючага сваю нацыянальную незалежнасць.

У батальных кампазіцыях Верашчагіна галоўнай дзеючай асобай выступае радавы салдат. Кожная такая карціна—гімн апранутай у салдацкі шынель, пакутуючай народнай масе. Раней на першым плане паказвалі генералаў,—Верашчагін паказаў рускага мужыка, апранутага ў форму салдата. Раней мастакі па-казённаму праслаўлялі подвігі арыстакратычнага афіцэрства і самаахвярнасць духавенства,—Верашчагін не пабаяўся выкрыць крывадушнасць і подласць духавенства («Пакаранне першамартаўцаў у Расіі»), разлажэнне і жорсткасць царскага генералітэта («На Шыпку ўсё спакойна», «Забытыя»). Сувязь верашчагінскіх вобразаў з думамі і пакутамі народа, народнасць многіх твораў мастака—характэрная рыса творчасці гэтага рускага баталіста.

Вобраз рускага салдата, асуджанага па волі і ў інтарэсах «гаспод» на пакуты і смерць, пакінутага ў далёкай краіне,—вобраз, які маляваўся ў сэрцах мільёнаў,— пад кісцю Верашчагіна атрымаў яркае ўвасабленне.

Вышэй было адзначана, што Верашчагін імкнуўся паказваць толькі тое, што ён добра вывучыў, бачыў, прачуў. Толькі ў гэтым выпадку, па думцы мастака, яго карціны маглі быць пераканаўчымі. Дакументальнасць творчасці Верашчагіна здзіўляючая. Характэрнай асаблівасцю творчага метаду мастака з'яўляецца тое, што ён засноўваў свае работы на дзесятках і сотнях асабіста ім бачаных і праверанных фактаў і дакументаў. Ярка намаляван вобраз гэтага энтузіяста ў наступных радках успамінаў Немiровіча-Данчэнка з перыяду руска-турэцкай вайны:

«Васіль Васільевіч да вячэрняй зары кожны дзень працаваў там, малюючы з натуры карціны, поўныя нечалавечага жаху. Я здзіўляўся і тады, да якой ступені напружаны нервы ў Верашчагіна..., які проста з сядла садзіўся на паходны табурэцік, маляваў цэлыя дні. Ён не толькі маляваў,—ён збіраў і звозіў з поля цэлыя груды прамочанага крывёю рыззя, абломкі зброі, мундзіры турэцкіх салдатаў. Да некаторых з гэтых рэчаў было брыдка дакрануцца, але такі рэаліст, як Верашчагін, уласнаручна звязваў іх у вузлы і цягаў да сябе».

Гэта імкненне мастака к дакументальнасці ніякім чынам не дае права думаць, што ён быў прыхільнікам натуралістычнага падыходу ў жывапісу. У адной з сваіх прац Верашчагін піша: «Я... сцвярджаю, што ў тых выпадках, калі існуе толькі простае ўзнаўленне факта ці падзеі без усякай ідэі, без усякага абагульнення, можа быць і знойдуцца некаторыя рысы рэалістычнага выканання, але рэалізма тут не будзе і цэню, г. зн. таго асэнсаванага рэалізма, у аснове якога ляжаць наглядання і факты—у процілегласць ідэалізму, які грунтуецца на ўражаннях і паказаннях, устаноўленых апрыоры».

І ў самой творчасці Верашчагіна мы бачым нязменна ў кожным эцюдзе, у кожнай карціне абагульненне і наяўнасць ідэі, ідэі нянавісці да захватніцкай, несправядлівай вайны.

У буржуазным грамадстве Верашчагін падвяргаўся цкаванню і пастаянным праследванням. Мастака абвінавачвалі ў тым, што ён «прынізіў» царскую армію, што ён напаклёпнічаў на некаторых генералаў. Англійскія ўлады ў Індыі называлі Верашчагіна рускім шпіёнам, а царскі ўрад бачыў у ім «бунтара». Карціны Верашчагіна абліваліся сернай кіслатой. Капіраванне некаторых карцін забаранялася. Нямецкі генерал забараняў салдатам наведванне выставак работ мастака. Адзін венскі епіскап нават загадаў служыць ачышчальныя малебны ў сувязі з выстаўкай работ Верашчагіна.

Пад уплывам пастаянных праследванняў кансерватыўнай «крытыкі» мастак знішчыў рад сваіх каштоўных карцін («Акружылі—праследуюць», «Забытыя», «Увайшлі», «Бача і яго паклоннікі»). Верашчагін прымушан быў доўгі час жыць і працаваць за граніцай.

Верашчагін быў складанай і супярэчлівай натурай. Змагаючыся з захватніцкай вайной, ён часта быў непаслядоўным. Мастак не ведаў сапраўднай прычыны паходжання войн, ён не мог паказаць і сапраўднага шляху знішчэння войн. Верашчагін часта не разумеў прагрэсіўнага значэння вызваленчых войн. У творчасці Верашчагіна ёсць і іншыя недахопы. Як вядома, мастак, бліскуча паказваючы сотні нацыянальных тыпаў, батальных і бытавых сцэн, пейзажаў, архітэктуры і т. д., не змог стварыць глыбока псіхалагічных чалавечых тыпаў. У радзе карцін мастака дэталі і дробязі перашкаджаюць выяўленню галоўнага («Таржаствуюць» і інш.).

Але ўсе гэтыя недахопы не могуць нам перашкодзіць высока ацэньваць творчасць Верашчагіна.

Верашчагін не быў фармальна членам таварыства перадвіжнікаў, але па сваёй творчасці ён з'яўляецца яркім прадстаўніком гэтай перадавой мастацкай плыні XIX стагоддзя, сцвярджаўшай у мастацтве дэмакратычны рэалізм.

Агністы гуманізм, гарачая любоў к народу, глыбокае спачуванне яго пакутам, погляд на мастацтва як на сродак служэння інтарэсам шырокіх праца ўных мас —робяць батальны жывапіс Верашчагіна неадлучным ад мастацтва лепшых рускіх мастакоў другой паловы XIX стагоддзя. Верашчагін для нас не проста мастак, а мастак, які знаменаваў сваёй творчасцю цэлы этап у гісторыі сусветнага батальнага жывапісу. Верашчагін як ваенны мастак-рэаліст, які абвясціў нянавісць да захватніцкіх войн праз мастацкі пераказ перажытых падзей, з'яўляецца новай прагрэсіўнай з'явай у мастацтве, — з'явай, якая прадаўжае лепшыя традыцыі Калло і Гойя. Прынцыповая глыбіня і ідэйнасць творчасці, спалучэнне цвярозага рэалізма з ідэяй шчырага гуманізму і дэмакратычнасці робяць творчасць Верашчагіна для нас цяпер, як ніколі раней, актуальнай і цікавай.

Верашчагінская творчасць з уласцівым мастаку прыгожым, чоткім малюнкам, выдатна перадаючым самыя тонкія дэталі віртуознай архітэктуры, яго ўменне перадаваць яркае сонечнае святло, гарачае паўднёвае альбо суровае паўночнае неба, яго майстэрства прымушаць пейзаж выражаць сацыяльныя замыслы карціны, яго здольнасць малюнкам і колерам перадаваць характэрныя асаблівасці нацыянальных тыпаў, пейзажаў, касцюмаў — павінны стаць прадметам самага старанага вывучэння совецкіх мастакоў.

Верашчагінская творчасць каштоўна для нас зараз не толькі як узор мастацкага майстэрства. У дні, калі падпальшчыкі імперыялістычных войн на Захадзе і на Усходзе ўцягваюць народы ў новую сусветную бойню, верашчагінская творчасць з'яўляецца магутным сродкам антыімперыялістычнай прапаганды.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск. друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № К—1079.